Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 16 1933 г. СЕРАДА № 180 (4730) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Да 50-годзьдзя тав. ШКІРАТАВА

ДАРАГІ МАТВЕЙ ХВЁДАРАВІЧ!

Сяброўскі вітаем цябе ў дзень твайго 50-годзьдзя. Упэўнены, што ты і ў далейшым будзеш, як і цяпер, бадзёра і стойка змагацца за чыстату ленінскага сьцягу і вытрыманасьць радоў нашай вялікай партыі

І. Сталін, В. Молатаў, К. Варашылаў, Л. М. Кагановіч, С. Арджанікідзэ, С. Кіраў, М. Калінін, А. Андрэяў, А. Мікаян

З 20 ЖНІЎНЯ РАЗГАРНУЦЬ СЯЎБУ АЗІМЫХ

Падрыхтаваць да сяўбы зямельныя вучасткі і насеньфонды, у тэрмін засеяць 60.000 га азімай пшаніцы!

Аб дапамозе бескароўным калгасьнікам у набыцьці кароў

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

Умэтах хутчэйшага ажыцьцяўленьня пастаўленай партыяй і ўрадам задачы забесьпячэньня каровамі калгасьнікаў, якія ня маюць кароў у сваім асабістым карыстаньні, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны камітэт Усесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) пастанаўляюць правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Арганізаваць на працягу 1933 г. дзяржаўную дапамогу бескароўным калгасьнікам Украінскай ССР, Беларускай ССР, Паўночна-Каўкаскага краю, Ніжняволскага краю, Сярэдня-Волскага краю, Цэнтральнай чорназемнай вобласьці, Маскоўскай вобласьці, Заходняй вобласьці, Уральскай вобласьці, Казакскай АССР, Сярэдняй Азіі, Далёка-Ўсходняга краю ў справе набыцьця імі на ільготных умовах цёлак у колькасьці 1.000.000 (аднаго млн.) галоў.

2. У гэтых мэтах:

а) набыць у малочна-таварных калгасных фэрм і ў калгасаў, якія маюць аграмаджанае стада, у пералічаных у пункце першым рэспубліках, краёх і абласьцях 228 тысяч цёлак ва ўзросьце да 8 месяцаў;

б) набыць у калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія маюць кароў у сваім асабістым карыстаньні, у парадку закупкі в папярэдняй кантрактацыяй, 772 тысячы цёлак ва ўзросьце да 8 месяцаў.

3. Зацьвердзіць наступны план закупкі цёлак па рэспубліках, краёх і абласьцях:

	Усяго:	У тым ліку: За кошт прыплоду малочна-таварных фэрм і аграмаджанага стада калгасаў	За кошт закупкі ў калгасьнікаў і ў усіх аднаасобнікаў
	(У тысячах галоў)		
Украінская ССР	275	40	235
Паўночна-Каўкаскі край	100	35	65
ЦЧВ	110	14	96
Сярэдня-Волск. край	85	18	67
Ніжня-Волскі край	70	16	54
Уральская вобласьць	80	27	53
Маскоўская вобласьць	70	10	60
Казакская АССР	65	45	20
Заходняя вобласьць	50	8	42
Далёка-Ўсходні край	15	2	13
Беларуская ССР	40	10	30
Сярэдняя Азія	40	3	37

4. Перакідак закупленых цёлак аднэй вобласьцю ў другую не рабіць.

5. Абавязаць СНК саюзных і аўтаномных рэспублік, краявыя і абласныя выканкомы, ЦК нацкампартый, крайкомы і абкомы пералічаных у п. 1-м рэспублік, краёў і абласьцей скласьці ў двухдэкадны тэрмін параённыя пляны вылучэньня, закупкі і кантрактацыі цёлак і пляны пазьзяленьня імі калгасьнікаў, з указаньнем, якая частка цёлак павінна быць перакінута з аднаго раёну ў другі, і прасачыць за правядзеньнем гэтых плянаў.

6. Арганізуемую па аснове данай пастановы дзяржаўную дапамогу бескароўным калгасьнікам у набыцьці цёлак аказваць у першую чаргу лепшым калгасьнікам-ударнікам.

7. Вылучаемых з прыплоду малочна-таварных фэрм і апрамаджанага калгаснага стада цёлак здаваць членам данага калгасу за наліўны разьлік, ці з растэрміноўкаю да аднаго году ў кошт выпрацаваных працадзён.

8. У мэтах палягчэньня набыцьця цёлак прадаставіць калгасьнікам, якія ня маюць магчымасьці аплаціць наліўнымі грашыма іх поўны кошт, трашовы кредыт за кошт дзяржавы ў сярэднім у межах 50 проц. кошту цёлкі з растэрміноўкай пагашэньня да аднаго году.

9. Для аказаньня кредытнай дапамогі маламоцным бескароўным калгасьнікам у справе набыцьця цёлак выдзеліць за кошт дзяржавы 35 млн. руб., у тым ліку 5 млн. руб. для аказаньня дапамогі пры набыцьці цёлак з прыплоду малочна-таварных фэрм.

10. Дзяржаўную кредытную дапамогу аказваць праз раённыя аддзяленьні сельска-гаспадарчага банку, прычым кредыт прадастаўляць кожнаму калгасьніку ў паасобку на аснове індывідуальнага з ім дагавору. Рэспубліканскім, краявым і абласным арганізацыям прадаставіць права дыфэрэнцыяваць разьмер кредыту па раёнах.

11. Закупку і кантрактацыю цёлак у калгасьнікаў і аднаасобнікаў рабіць па канвэнцыйных цэнах.

12. Калгасьнікам і аднаасобнікам, якія прадаюць і выпойваюць цёлак у парадку кантрактацыі для продажу бескароўным калгасьнікам, прадаставіць ільготу па здачы малака дзяржаве ў выглядзе скідкі 25 проц. з гадавога пляну і ільготу па здачы мяса дзяржаве ў выглядзе скідкі 20 проц. гадавога пляну.

13. Дагавары аб кантрактацыі цёлак для ўказанай мэты рэгістраваць у сельсаветах.

14. Арганізацыю закупкі і кантрактацыю цёлак ускласьці на праўленьні калгасаў і абавязаць старшынь сельсаветаў і раённых выканкомаў аказаць ім у гэтай справе ўсямерную садзейнасьць, прычым пры куплі цёлак у сваім калгасе ці ў бліжэйшым раёне, да адбору і куплі цёлак абавязкова прыцягваць пакупцоў цёлак — калгасьніц і калгасьнікаў.

15. Прапанаваць саўнаркомам саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам, ЦК нацкампартый, крайкомам і абкомам усіх астатніх рэспублік, краёў і абласьцей, ня ўказаных у данай пастанове, распрацаваць у месячны тэрмін меры па арганізацыі куплі цёлак калгасьнікам, якія ня маюць кароў у сваім асабістым карыстаньні, і прадставіць іх на разгляд СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б).

Старшыня СНК Саюзу ССР В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

САБАТАЖНІКІ СЯЎБЫ

БАБРУЙСК, 15. (Па тэлефону).

Раён зусім ня рыхтуецца да сяўбы азімых. Пляны сяўбы і па сёнешні дзень яшчэ не даведзены да сельсаветаў і калгасаў.

Значная доля віны падае на НКЗ БССР, які за апошні тыдзень тры разы зьмяняў раённы плян. Але гэта нікольскі не апраўдвае бязьдзейнасьці райземаддзелу (загадчык **ПАТАПЕНКА**), які меў даволі часу, каб давесьці заданьні да калгасаў.

***

КАМАРЫН.

Сяўба азімых у раёне павінна ўжо была разгарнуцца. Райземаддзел, аднак, і па сёнешні дзень нічога не зрабіў, каб забясьпечыць своячасовае правядзеньне сяўбы азімых. Няма ніякіх плянаў, ні заданьняў. Райземаддзел ня прымае літаральна ніякіх мер.

***

РАГАЧОЎ.

Праўленьне калгасу **«БАРАЦЬБІТ»**, і перш за ўсё яго старшыня **Ткачоў**, сабатуе сяўбу азімай пшаніцы. Азімы клін у калгасе зарос пустазельлем, а ворыва не распачата. **ТКАЧОЎ** адкрыта адмаўляецца сеяць азімую пшаніцу, па-кулацку заяўляючы, што «на нашай зямлі пшаніца ня ўродзіць».

ЯКУТОВІЧ.

Носьбіты кулацкіх тэндэнцый

ШКЛОЎ.

Адсутнасьць класавай пільнасьці ў паасобных сельсаветах і калгасах Шклоўшчыны прыводзіць да грубейшага ўказаньня закону аб збожжапастаўках.

У калгасе **«Пралетары»**, Старасельскага сельсавету, на чале якога стаіць кулацкі агент **Казакоў**, трымаюцца антыдзяржаўнага лёзунгу— «першы абмалот — сабе». У калгасе прыступілі ўжо да разьмеркаваньня збожжа, ня здаўшы пяводнага кілёграма па цьвёрдых пастаўках.

На чале калгасу **«Энергія»** (Аляксандраўскі сельсавет) стаіць перарадженец з партбілетам у кішэні **Зайцаў**, які праводзіць такую-ж кулацкую палітыку, як і старшыня калгасу **«Пралетары»**. Тут таксама прыступілі да раздачы збожжа першага абмалоту калгасьнікам, ня выконваючы абавязкаў перад дзяржавай.

І яшчэ факт: у калгасе **1-га мая**, Нікіцінскага сельсавету, 1-га жніўня намалацілі 145 пудоў збожжа. З гэтай колькасьці дзяржаве здана толькі 30 пудоў, а 115 пудоў старшыня калгасу **Антанавіч** раздаў па авансы. Гэтым груба парушана дырэктыва партыі і ўраду аб выдачы аванасу ў разьмеры 10 проц. фактычнага абмалоту.

А. Міравой.

Сідляровы Паўла (трактарыст) і Андрэй (машынавед) зжынаюць 7 гэктараў у дзень пры высокай якасьці работы.

Да суровага адказу

Кіраўнікі раду калгасаў, абслугоўваемых Менскай МТС, замест мабілізацыі мас калгасьнікаў на выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай па збожжаздачы, праводзяць антыдзяржаўную кулацкую практыку, груба парушаюць дырэктывы партыі і ўраду.

Старшыня калгасу **«КІМ» Валек**, брыгадзір калгасу «Ленінскі шлях»— **Шаевіч** і старшыня калгасу «Чырвоны барацьбіт» **Падабед** замест здачы збожжа дзяржаве і выдачы калгасьнікам толькі 10 проц. фактычнага абмалоту, размяркавалі поўнасьцю ўвесь першы абмалот авансам у лік працадзён.

Палітаддзел Менскай МТС, выкрыўшы гэтыя факты злачынной дзейнасьці, зьняў з працы і прыцягнуў да суровай адказнасьці усіх вышэй пералічаных асоб.

Сакратар парт'ячэйкі калгасу **«Ленінскі шлях»** тав. **Сіўца**, ведаючы аб гэтых фактах, правяў да іх гніла-ліберальныя адносіны, яўна патурае кулацка-рвацкім, антыдзяржаўным настроям. Палітаддзел зьняў тав. **Сіўца** з работы.

Прыцягнуты таксама да адказнасьці загадчыкі вытворчых вучасткаў **Ганчарэнка і Бухцілаў**.

Палітаддзел папярэдзіў усіх загадчыкаў вытворчых вучасткаў, старшынь і брыгадзіраў калгасаў, сакратароў парт'ячэек і кандыдацкіх груп, партгіраўнікоў і парторгаў, што за парушэньне дырэктыў партыі і ўраду аб збожжапастаўках і разьмеркаваньні ўраджаю па працадзёх яны будуць прыцягнуты да партыйнай і судовай адказнасьці.

ЧЫРВОНЫ АБОЗ У АДЗНАКУ ПРЫЕЗДУ т. ГІКАЛО

ВОРША. (Па тэлефону ад нашага спец. кар.).

У адзнаку прыезду тав. ГІКАЛО ў Воршу, 15 жніўня ў раён прыбыў вялікі чырвоны абоз, у якім прымала ўдзел каля 150 калгасаў і вялікая колькасьць аднаасобнікаў. ЗА ДЗЕНЬ ЗДАНА ЗВЫШ 200 ТОН ДОБРАЯКАСНАГА ЗБОЖЖА.

КІПЭР.

У ПАГОНІ ЗА ТЭМПАМІ ІГНАРУЮЦЬ ЯКАСЬЦЬ

ТУРАЎ.

У калгасе **«НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ»** абмалочана звыш 100 коп жыта. Але праўленьне калгасу і вучастковы агранам **Міронаў** у пагоні за тэмпамі ігнаруюць якасьць. У выніку надбайнай малацьбы каля 10 роц. зерня застаецца ў саломе.

Неабходна зараз-жа спыніць гэта шкодніцкае разбазарваньне збожжа Віцебскай у дрэннай якасьці малацьбы павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

У. К.

АБ АХОВЕ УРАДЖАЮ У КАЛГАСАХ „КУЛЬТУРА" І „УДАРНІК", БАРЫСАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНУ

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 13-VIII-1933 г.

У выніку праведзенага апітмасам ЦК КП(б)Б сумесна з РК і райКК КП(б)Б і палітаддзеламі МТС рэйду-праверкі становішча аховы ўраджаю ў паказаных калгасах Дзяржынскага раёну, устаноўлена, што ніякай аховы ўраджаю на палёх у сапраўднасьці няма (у калгасе «Культура» і «Ўдарнік» не арганізавана ахова зжатых азімых на полі, у калгасе «Культура» на месцы выкрыта, што стайні ў начны час адчынены, вартаўнік сыціць і г. д.).

ЦК лічыць, што гэтыя факты, як і рад іншых сыгналаў, сьведчаць аб недапушчальна-злачынных адносінах з боку кіраўніцтва асобных сельсаветаў, калгасаў і раёнаў да аховы сацыялістычнай маемасьці.

1. ЦК прапануе, пад асабістую адказнасьць сакратароў РК, у трохдзённы тэрмін перагледзець склад вартаўнікоў, аб'ехаць, выпраўшы кулацка-чужыя і ненадзейныя элементы, а таксама зьмяніўшы вартаўнікоў, якія зьяўляюцца зусім непрацаздольнымі.

2. На працягу трох дзён правесьці інструктаж вартаўнікоў і аб'ехаць для растлумачэньня іх ролі, абавязкаў і адказнасьці за ахову калгаснай маемасьці. Ва ўсіх буйных калгасах увесьці, асабліва ў начны час, вартаўнікоў коняй.

3. Даручыць РК і палітаддзелам на працягу пяці дзён правесьці рэйд-праверку аховы ўраджаю і становішча супрацьпажарнай справы, з ацэнгненьнем для гэтай справы старшынь і брыгадзіраў, спаборнічаючых паміж сабою калгасаў. Выніку і практычныя прапановы па гэтай праверцы павінны быць абмеркаваны на калгасных брыгадах і рэалізаваны не пазьней, чым праз два дні пасьля рэйду-праверкі.

4. ЦК падкрэсьлівае, што неабходна з усёй рашучасьцю прыцягваць да судовай адказнасьці вартаўнікоў і аб'ехчыкаў за кожную ня ўскрытую імі патраву ці раскрадаваньне. Адначасова ўстанавіць, што вартаўнік або калгасьнік, якія зловяць раскрадальнікаў, павінны прэміявацца. Прэмія гэта павінна выдавацца або выплачвацца безадкладна.

5. Даручыць ЦК ЛКСМБ і РК на падставе вопыту Паўночна-Каўкаскага краю арганізаваць атрады пёгкай кавалерыі па ахове калгаснага ўраджаю з піку піянэраў і школьнікаў.

6. Даручыць цэнтральным і раённым газэтам рэгулярна асьвятляць становішча аховы ўраджаю і калгаснай маемасьці, безадкладна апублікаваўшы пастанову народных судоў аб фактах раскрадаваньня.

7. Указаць Дзяржынскаму РК КП(б)Б, што з яго боку ня было прынята належных апэрацыйных мэр па наладжваньні аховы ўраджаю ў раёне. Даручыць Дзяржынскаму РК прыцягнуць да адказнасьці выкрытых у часе рэйду вінаватых у адпнай пастаноўцы аховы ўраджаю і, у прыватнасьці, у калгасах «Культура» і «Ўдарнік», а так сама пракурору рэспублікі аддаць пад суд вінаватых у тым, што два трактары Путчынскай МТС былі на ноч пакінуты на полі бяз усялякай аховы.

ЦК прапануе ГК і РК КП(б)Б шляхам разгорнутай масавай работы, завастраючы ўсё больш пільнасьць калгасьнікаў на барацьбу са спробамі кулака, подыра, гультая раскрадаць калгасны ўраджай, дабіцца таго, каб ні адзін кілёграм збожжа на полі, у сьвірні, пры перавозцы на загатпункт ня быў-бы ўкрадзен, страчан або зьмішчан.

ЦК даручае РК і палітаддзелам арганізаваць прапрацоўку гэтай пастановы ЦК па ўсіх калгасных і саўгасных брыгадах.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

ЗАЦЯГВАЮЦЬ АБМАЛОТ, САБАТУЮЦЬ ПАСТАЎКІ

ГАРАДОК.

Некаторыя калгасы раёну зжалі ўжо азімыя на 50-70 проц. (калгасы «Новае жыцьцё», «Шлях да сацыялізму» і інш.).

Ня гледзячы на выключна добрае надвор'е, многія калгасы яшчэ не прыступілі да абмалоту. У раёне пачынаюць такія настроі: «спачатку поўнасьцю скончым жніво, а потым пачнем малаціць». Гэтыя настроі не вытрымліваюць адпору з боку кіруючых раённых арганізацый.

Старшыня калгасу **«КІМ»**, Газьбінскага сельсавету, кандыдат партыі **Штыкаў** і старшыня калгасу **«Перамога»**, Зайкаўскага сельсавету—**Вельгавольскі** яшчэ і ня думаюць аб пачатку малацьбы. Яны толькі зьбіраюцца паехаць у Ленінград за рухавіком для малатарні.

У калгасе **«Чырвоны араты»** старшыня праўленьня **Цімафееў**, ня здаўшы ні аднаго грама збожжа дзяржаве, разьмеркаваў паміж калгасьнікамі 300 снапоў жыта. Старшыня калгасу **«Свабода»** Зайкаўскага сельсавету, **Паўлаў** раздаў калгасьнікам 240 снапоў жыта, таксама ня думаючы аб выкананьні абавязкаў перад дзяржавай. Такія-ж факты маюць месца і ў калгасе «Чырвоная Зорка».

Кулацка-рвацкія тэндэнцыі ў калгасах не сустракаюць адпору з боку раённых арганізацый. Сабатажнікі цьвёрдых паставак застаюцца беспакаранымі.

Т. Чыжыкаў, А. Хаткін.

КУЛАЦКІ АГЕНТ ЗРЫВАЕ АБМАЛОТ І ЗБОЖЖАЗДАЧУ

МАГІЛЕЎ.

Калгас **«ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН»**, Дабрасьневіцкага сельсавету, паводле пляну павінен быў да 7 жніўня зжаць 20 га жыта, а зжаў толькі 13 га.

Уборка ў калгасе не спалучаецца з малацьбой і збожжаздачай дзяржаве.

Старшыня калгасу **Вайчайціс** на патрабаваньні калгасьнікаў - ударнікаў пачаць малацьбу і збожжаздачу адказвае:

— Я гаспадар, што хачу, тое і раблю.

Вайчайціс жыўся з заможнікамі **Мікушкіным, Гарбузовым, Цітовым** і іншымі і далажам падпаў пад іх уплыў. Былі выпадкі, калі Вайчайціс разам з загадчыкам гаспадаркі капаў калгасную бульбу і адвозілі яе прадаваць на рынку. Злачынцы дагэтуль застаюцца беспакаранымі.

Палітаддзел МТС і парт'ячэйка павінны неадкладна праверыць становішча ў калгасе «Чырвоны партызан», забясьпечыць ударныя тэмпы абмалоту і здачу збожжа дзяржаве.

«К. М.».

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗАСЕЯЦЬ АЗІМЫЯ, УЗАРАЦЬ ЗЯБ!

МАСАВАЯ СЯЎБА АЗІМЫХ — НА ПАРОЗЕ. 20 ЖНІЎНЯ — апошні тэрмін пачатку сяўбы. Раньняя сяўба — найпершая ўмова, якая забясьпечвае высокі ўраджай азімых.

Задача заключаецца ў тым, каб рашуча паскараючы ўборку, абмалот і пастаўкі збожжа, ужо зараз, сёньня прыступіць да сяўбы.

Калгас **«ЧЫРВОНЫ ЗЯМЛЯРОБ»** яшчэ да 12 жніўня засеяў першыя 7 га азімых. Завяршаючы ўборку, калгас разгортвае далейшую сяўбу. Уся плошча пад азімыя загадзя падрыхтавана.

Так трэба працаваць усім калгасам нашай рэспублікі. Своячасова разгарнуць сяўбу з тым, каб скончыць яе максымум да 5 верасьня — гэта дырэктыва ЦК нашай партыі павінна быць поўнасьцю і безагаворачна ажыцьцёўлена.

А як у нас з падрыхтоўкай да сяўбы? Весткі з раёнаў сыгналізуюць аб ганебнейшым адставаньні.

Па-ранейшаму ня спынена злачынней шая цяганіна з плянамі. Трэба сеяць, аднак, яшчэ і па сёнешні дзень у раёнах, за рэдкім выключэньнем, няма ніякіх плянаў.

Характэрнай ілюстрацыяй зьяўляецца **МСЬЦІСЛАЎСКІ** раён. Насеўныя заданьні ня толькі не даведзены да калгасаў, але нават яшчэ ня складзены. На шматлікія просьбы і заявы калгасаў райземаддзел дае адзін і той жа стэрэатыпны адказ:

— Раней абмерым, а потым пляны.

Адным словам, кіраўнікі райземаддзелу (Старасьцін і Казлоўскі) абяцаюць калгасам даць пляны... да новага году.

Як назваць гэтых людзей? Сабатажнікамі дырэктыў ЦК і СНК, дэзарганізатарамі сяўбы, бюрократамі, якія льлюць ваду па млын кулака.

Мсьціслаўе — не выключэньне. Літаральна аналёгічныя факты ёсьць у **ПОЛАЦКІМ, РЭЧЫЦКІМ, КАМАРЫНСКІМ, БАБРУЙСКІМ** і іншых раёнах. Зьдзіўляе поўная бяструботнасьць **НКЗ БССР**, які і па сёнешні дзень не ўжыў ніякіх захадаў, каб пакончыць з гэтай злачынной цяганінай.

Няўжо-ж пляновы сэктар НКЗ БССР не разумее, што такія бесадказныя адносіны да плянаваньня дапамагаюць апартуністычным элементам у іх спробах скараціць азімы клін?

Колькі трэба яшчэ напамінаньняў НКЗ БССР?

Нельга сеяць усьлепую, без дакладных і цьвёрда ўстаноўленых плянаў. Кожны раён, кожны сельсавет і калгас павінны мець выразны плян на сяўбе азімых і неадкладна прыступіць да яго выкананьня.

Азімы клін у асноўным прыпадае на занятыя папары. На чыстых папарах будзе засеяна толькі 1/3 азімых. Адсюль зразумела, што на падрыхтоўку палёў да сяўбы трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, і перш за ўсё на падрыхтоўку вучасткаў пад азімую пшаніцу.

Тэрмін ворыва вучасткаў пад азімыя мінуў. Што зроблена?

Зноў прыходзіцца даваць рэзка адмоўны адказ. Паўторнае ворыва чыстых папараў фактычна зусім не разгорнута. У цэлым радзе раёнаў, асабліва **СІРОЦІНСКІМ, БЕШАНКОВІЦКІМ** і г. д., папары зарасьлі пустазельлем. Культывацыя не праведзена. Папары, як правіла, яшчэ ня ўгноены.

Злачынства цярпець хоць мінуту далей такое становішча. Кожны гэктар чыстых папараў павінен быць неадкладна, зараз-жа падрыхтаван да сяўбы. Трэба неадкладна правесьці паўторнае ворыва, і пры тым на поўную глыбіню — 15-18 см. Кожны гэктар трэба добра прабаранаваць, добра ўгнаіць. Час не чакае. Трэба даражыць кожнай мінутай і зараз-жа закончыць падрыхтоўку ўсёй плошчы пад азімы клін.

Асаблівая ўвага — неадкладнаму правядзеньню ворыва на занятых папарах — на палёх з-пад вікі, раньняй бульбы, сілосных культур і г. д.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА АЗІМАЙ СЯЎБЫ — МАКСЫМАЛЬНАЕ ПАШЫРЭНЬНЕ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ. Як мінімум, яе трэба засеяць 60 тыс. гэктараў. Гэта зусім рэальная лічба, але, зразумела, самацёкам, рэалізуемымі 60 тыс. га не асвоіш. Патрэбна мабілізацыя ўсіх унутраных рэсурсаў насельня, патрэбна мабілізацыя ўсіх сіл на падрыхтоўку лепшых зямель пад азімыя і непасроднае правядзеньне сяўбы.

Знаходзіцца, аднак, нямала людзей, якія пусьцілі ўсю справу на самацёк, патураючы, дапамагаючы тым самым кулацкім махінацыям, асабліва накіраваным супроць сяўбы азімай пшаніцы.

Кулак пускае ў ход контр-рэвалюцыйную лягенду, сэнс якой, прыкладна, у словах: «Беларусь не Украіна, у нас пшаніца ня родзіць».

Замест адпору кулацкім тэнтам, у радзе раёнаў патураюць антыпшанічным настроям, сабатуюць падрыхтоўку палёў пад азімую пшаніцу.

У Рагачоўскім раёне, напрыклад, у цэлым радзе калгасаў (**«БАРАЦЬБІТ»** і г. д.) адкрыта адмаўляюцца сеяць пшаніцу, бо яна нібыта «ўсё роўна ня ўродзіць».

Кулацкае супраціўленьне ідзе ня толькі па лініі правакацыйнай агітацыі. Недабіты вораг імкнецца разбазарыць насеньне. Замест адпору гэтым кулацкім вылазкам, паасобныя раённыя арганізацыі (**ДУБРОВЕНСКІ** раён) адкрыта патураюць разбазарваньню насеньня, прапануючы выдаваць насенную пшаніцу на авансы.

Трэба зламаць кулацкі сабатаж сяўбы і да канца выкрыць апартуністаў, якія патураюць кулацкаму супраціўленьню.

Дзьве баявыя задачы стаяць перад намі. Першая — **НЕАДКЛАДНА ПАДРЫХТАВАЦЬ ВУЧАСТКІ ПАД АЗІМУЮ ПШАНІЦУ.** Другая — **МАБІЛІЗАВАЦЬ АДНАЧАСОВА ЎСЕ ЎНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ НАСЕНЬНЯ,** правесьці міжраённы і міжкалгасны абмен, пратрудніць кожны грам насеннай пшаніцы. Пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай, трэба захаваць і падрыхтаваць усё насеньне пшаніцы, рашуча спыняючы малейшыя спробы скарыстаць яе на спажывецкія мэты.

Бальшавіцкія тэмпы і якасьць асеньняй сяўбы — зарука высокіх ураджаў азімых. Трэба, аднак, кожную мінуту памятаць, што **ПОСЬПЕХ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ, УРАДЖАЙ ЯРАВЫХ ТАКСАМА КРОЎНА ЗАЛЕЖАЦЬ АД НАШАЙ РАБОТЫ СЁНЬНЯ.**

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб **ЗЯБЛІВЫМ ВОРЫВЕ** — важнейшы гаспадарча-палітычны дакумант.

Своячасова і добра ўзьнятае зяблева — гэта рост ураджайнасьці яравых на 30-40 проц. СНК і ЦК далі сваёй пастановай канкрэтную праграму работы. За зяблева трэба ўзяцца сёньня-ж, зараз. Трэба загадзя і дакладна расставіць сілы так, каб забясьпечыць ня толькі поўнае, высокаякаснае і своячасовае правядзеньне ўборкі, абмалоту, цьвёрдых с.-г. паставак і асеньняй сяўбы, але, што асабліва важна, і зяблевае ворыва, асваеньне новых цалінных зямель.

За зяблева, як і за асеньнюю сяўбу, адказвае пастаянная вытворчая брыгада на сваім вучастку. Сюды, на арганізацыю працы ў брыгадзе, на расстаноўку сіл — максымум увагі.

СВАЯЧАСОВА І Ў ТЭРМІН ЗАСЕЕМ АЗІМЫ КОЛІН, ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ ЯРАВЫХ УДАРНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ЗЯБЛІВАГА ВОРЫВА!

Усесаюзная ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

„Сацыялістычнае спаборніцтва — ворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш—ДАГАНЯЙ ЛЕПШЫХ І ДАБІСЯ АГУЛЬНАГА УЗДЫМУ"

(СТАЛІН)

Па прадстаўленьні Адэскага выканаўчага камітэту і абласнога камітэту КП(б)У, заносіцца на ўсесаюзную чырвоную дошку:

Калгас „Чырвоны маяк", Адэскага раёну.

Уборку збожжавых культур на плошчы ў 2.177 га калгас „Чырвоны маяк" закончыў за 7 дзён, у той час як у мінулым годзе на уборку было затрачана 22 дні. **Усё збожжа зьвязана ў снапы, праведзена падвойнае падграбаньне налосьсяў.** На трэці дзень касавіцы калгас пачаў малацьбу, а па дзесяты дзень малацьбы калгас поўнасьцю выканаў гадавы плян збожжапаставак — 5.821 цэнтнэр. Унесена поўнасьцю натуралата МТС. Пасьля есьпікі насеннага, страхавога і фуражнага фондаў **калгасьнікі атрымліваюць на працадзень 8 кгр. збожжа, замест 1,9 кгр. у мінулым годзе.** Усяго ў калгасе 286 гаспадарак.

Лепшыя брыгады ў калгасе—5-ая і 3-ая.

Старшыня калгасу—тав. **Нявінскі.**

Сакратар ячэйкі—тав. **Навіцкі.**

Лепшыя ўдарнікі—т. т. **Лубенскі**—брыгадзір пятай брыгады, **Лекгер**—брыгадзір трэцяй брыгады, калгасьнікі: **Ісаенка Цярэнці, Сьлюсарэнка Андрэй, Гаркуша Клаўдзія, Голуб Пелагея.**

Па прадстаўленьні Харкаўскага абласнога выканаўчага камітэту і абласнога камітэту КП(б)У заносіцца на ўсесаюзную чырвоную дошку:

Калгас імя Пятроўскага, Чугуеўскага раёну.

Калгас імя Пятроўскага дабіўся значных посьпехаў у павышэньні ўраджайнасьці: азімай пшаніцы сабрана ў сярэднім 16 цэнтн. з га, яравой пшаніцы —13 цэнтн. з га. Калгас поўнасьцю выканаў гадавы плян збожжапаставак, здаўшы 1.068 цэнтнэраў збожжа. Унесена натуралата МТС, зьвернута харчэсуда. Пасьля стварэньня насеннага, страхавога і фуражнага фондаў на працадзень прыпадае ў сярэднім 10 кгр. збожжа. Старшыня калгасу—тав. **Піўнёў Васіль Грыгоравіч.**

Лепшыя ударнікі-калгасьнікі: брыгадзір тав. **Палякоў Алексей, Баркалаў Пілип, Сьляпанаў Фёдар, Камішнін Якуб, Дарунін Фёдар, Гарбунова Ульяна, Тарусін Аляксандар, Мушнёў Барыс.**

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Некаторыя вынікі работы палітаддзелу

(Гутарка з начальнікам палітаддзелу Танежыцкай МТС, Чырвона-Слабодзкага раёну, т. ШЭФТАРАМ)

Танежыцкая МТС у раёне сваей дзейнасці налічвае 47 калгасаў, і 47 проц. калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак усяго Чырвона-Слабодзкага раёну.

Збожжа ў гэтым годзе на калгасных палёх нашага раёну нябывалае. Выйдзеш у поле — сэрца радуецца. Калгасы ніколі ня памятаюць такога ўраджаю. Добрага ўраджаю мы дабіліся таму, што моцна папрацавалі вясной, гаспадарна падышлі да справы, правільна разьлічылі, расставілі сілы, першымі ў БССР 18 мая скончылі веснавую сяўбу, за што атрымалі першую премію.

Кулакі і іх агентура кінулі з нашых раньніх і зьнятраньніх пасеваў, гаварылі: «Нічога ня выйдзе, згінуць».—Але дружныя ўсходы раньніх пасеваў упэўнілі разьбілі хлусьню клясавага ворага. Калгаснікі ў гэтым годзе атрымаюць ня менш як 14-15 цэнтнэраў з гектара ўраджаю.

Скончыўшы веснавую сяўбу, палітаддзел зараз-жа пераключыўся на прапалоку і ворыва папару. Да 15 чэрвеня ў нашых калгасах цалкам была прапалота азімая пшаніца, мы поўнасьцю прапалолі лён, яравыя збожжавыя культуры, кораньплоды, гароды, прабаранавалі і акучылі бульбу.

Палітаддзел добра ўлічыў асаблівасьці ўборкі гэтага году. Мы ня сталі чакаць пакуль пасьпее ўсё поле, а пачалі ўбіраць часткамі ў перыяд васковай сьпеласьці. Для нагляду за пасьпяваньнем пасеваў мы выкучылі з лепшых ударнікаў аб'ездчыкаў, вартаўнікоў, усклалі адказнасьць на палявых брыгады і 25 ліпеня на асобных вучастках пачалі жаць, а 27 ліпеня калгасы нашага раёну распачалі масавую ўборку жыта.

Уборка ўраджаю ў нашых калгасах узброена добра адрамантаванымі трактарамі, жнівяркамі-самаскідкамі, касілкамі, снопавязалкамі, граблямі і малатарнямі. Пад кіраўніцтвам палітаддзелу загатчыкі вытворчых вучастка, аграномы, брыгадзіры, разьбяныя механікі і трактарысты МТС аказваюць калгаснікам вялікую дапамогу ва ўборцы ўраджаю, ва ўмацаваньні калгасаў. Трактарысты семежаўскага і чырвона-слабодзкага вучасткаў паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы. Трактарысты гэтых вучастка ў нажынаюць за дзень 7 га азімых і 8 га яравых, у часе перапынку праводзяць з калгаснікамі вытворчыя нарады па абмене вопытам і па падагульненьні праробленай працы, прымаюць актыўны ўдзел у палявых брыгадных газэтах.

Не адстаюць ад трактарыстаў і машыністы. У калгасе «Нараджэньне сацыялізму» машыністы Канапляник, Жарскі і Дагдзілевіч паказалі рэкордныя нормы. Яны штодня зжынаюць 5-6 га коснай жнівяркай замест нормы 4 га. Уборка сярпамі намі арганізавана па зьвеньнях, амаль усе жанчыны перакрываюць свае нормы. Калгасьніцы гэтага-ж калгасу Кецка Вольга і Хралевіч Алеся замест нормы 0,10 га выжынаюць сярпамі 0,16—0,18 га.

Вялікую работу мы прарабілі па барацьбе са стратамі. Да кожнай машыны прыстасаваны зернаўлоўнікі, а да кос—грабелькі. На полі ўсё збожжа зьвязваецца ў снопы, каб пазбавіцца страт у часе перавозкі, калёсы накрываюцца рагожай у гумнах пастаўлены спэцыяльныя людзі, якія падмятаюць збожжа. Намі арганізаваны пілнэрскія брыгады, школьнікі, дзеці калгаснікаў па ўборцы каласоў на полі. 9 жніўня калгасы раёну дзейнасьці МТС скончылі ўборку азімага жыта, пачалі жаць ячмень, адначасова праходзіць абмалот і здача збожжа дзяржаве.

Нашы калгасы ў гэтым годзе разам з натураплатай МТС за работу павінны даць дзяржаве 1.011,5 тоны збожжа, таму палітаддзел вінець здачу збожжа дзяржаве ў самы кароткі тэрмін галоўнейшай задачай уборачнай кампаніі гэтага году. Яшчэ з 7 жніўня 23 складаныя трактарныя малатарні прыступілі да абмалоту калгаснага збожжа, арганізавана начная падвозка снапоў, кожная малатарня БДО-39 намалочвае 500 пудоў збожжа за дзень, ад малатарань арганізавана адвозка збожжа на прыёмачны пункт. Мы набудавалі нашу работу так, каб у жніўні поўнасьцю разьлічыцца з дзяржавай.

Уборка і абмалот праходзяць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулацкія прыхвасьні ня толькі крадуць самі, але скарыстоўваюць для гэтай мэты старых і дзяцей. Мы мелі факты, калі эвангеліст Васілеўскі накіраваў у калгас «Чырвоны вартаўнік» дзяцей абрэзаць каласы. У калгасе «Чырвоная Слабада» здоўлены кулакі Станевіч, Багдан і Апалойка Наста з мяшкамі ка дзенай бульбы. У калгасе «Новы шлях» кулакі Сановічы Іван, Майсей і Хвядора систематычна вымалочвалі вярняты, а пустыя снопы ставілі ў бабкі. У гэтым-жа калгасе кулак Пілат Яўхім паламаў у жнівярцы граблі, адрубаваў балты. Кулакі ўтыкаюць на полі жалезныя прутыі, каб паламаць снопавязалку, укладваюць у снапы каменьні, у малатарні жалеза, кілы («Чырвоны баец», «Ударнік», «Намунар»). Трэба адзначыць, што органы юстыцыі раёну не рашуча змагаюцца з клясавымі ворагамі, ня прыцягваюць іх да адказнасьці. Нельга ня спыніцца на фактах, калі апартуністычныя элементы перапікаджаюць рабоце палітаддзелу, імкнуцца скампрамітаваць яго работу. Напрыклад, сакратар чаллідкай партыйнай ячэйкі Сямашка першыя-ж мерапрыемствы па літаддзелу сустрэў у штыкі. «Вы што другі райком тут хочаце арганізаваць, ня выйдзе справа». Ён узброіўся супроць трактарных МТС'аўскіх малатарань: «Ня дам малаціць, нехай мелоцяць цапамі і конямі». Масавай работы з калгаснікамі Сямашка не вядзе: «Нехай палітаддзел наладзіць гэту работу, а мы пабачым», — кажа Сямашка. Ён забараніў калгасу «Прагрэс» прадаць для МТС ячмень для засеву вучастку, каня, і ўсё гэта прадаў на рынку прыватным асобам. Сямашка праганяў з калгаснага поля трактары МТС (калгас «Майскі прамень) загадваў калгаснікам не даваць трактарыстам харчоў, накіроўваў аладзеяў і п'яніц вартаваць склады МТС. Палітаддзел узьняў гэта пытаньне перад раённымі арганізацыямі, але райком на такія паводзіны Сямашкі ніяк не рэагаваў.

Наш раён прымежны, палітаддзел знаходзіцца за 10 кілёмэтраў ад раённага цэнтру, за 22 кілёмэтры ад чыгункі. Роля тэлефону, радыё, пошты зьяўляецца вялікай. А на самой справе ня так. Цэлымі гадзінамі даводзіцца званіць да сакратара райкому, бо на аднай лініі вісіць 7 апаратаў. Праз тры месяцы работы палітаддзелу ўдалося адваяваць апарат, радыё-аўдыторыі не працуюць, рабочкам палітаддзелу адмовілі радыёфі каваць кватэры. Аддзел сувязі БССР аб гэтым добра ведае, але чамусьці маўчыць.

Ня зусім добра стаіць справа з партыйнай праслойкай у калгасах. У раёне налічваецца 294 члены і кандыдаты партыі, з якіх па сельсаветах працуюць усяго 50, а непасрэдна ў калгасных ячэйках—толькі 9. Выходзячы з рашэньня ЦК аб рабоце палітаддзелаў, аб калгасных ячэйках і ўзаемаадносінах палітаддзелаў з райкомамі, мы паставілі пытаньне перад РК КП(б)В аб вылучэньні камуністаў для непасрэднай работы ў калгасе. Раённы камітэт вылучыў нам 10 таварышоў з раённых работнікаў, якія накіраваны намі непасрэдна ў калгасы для ўмацаваньня партыйнай работы. Мы на сёньняшні дзень у калгасах імя Войкава і «Перамога» арганізавалі ячэйкі, у калгасе «Дук» створана кандыдацкая група, усяго па калгасах раёну дзейнасьці МТС на сёньняшні дзень намі арганізаваны 2 партыйныя ячэйкі, 7 кандыдацкіх груп, чатыры партыйна-камсамольскія ядры, але ў нас яшчэ за стаецца 13 калгасаў, у якіх няма ні аднаго камуніста.

Перабудова ячэек, стварэньне кандыдацкіх груп і вылучэньне парторгаў у брыгадах значна палепшыла партыйна-масавую работу, наблізіла апэрацыйнае кіраўніцтва, павысіла клясавую пільнасьць, узьняло прадукцыйнасьць працы ў калгасах. І мы маем ужо станоўчыя вынікі гэтай перабудовы. Калі раней у калгасе імя Войкава адыход сьвіней складаў 30 проц., дык зараз ён даведзен да нуля. У тых калгасах, дзе арганізаваны ячэйкі, створаны кандыдацкія групы, раней скончана ўборка жыта. Адразу відаць, што пільнае вока выкрывае клясавага ворага, камуністы выступаюць арганізатарамі мас, мабілізуюць іх на барацьбу з кулацкім ахвосьцем і яго агентурай.



Агрэгат ільнацерабілак Зайчанкі пры высокай якасьці ільнацерабленьня выпрацоўвае 2 гэкт. за зьмену.

„ФАКТЫ АБВІНАВАЧВАЮЦЬ"

„РЭЧЫЦКАЯ ПРАУДА"

21 ліпеня «Р. П.» у артыкуле, прысьвечаным падрыхтоўцы да чысткі партарганізацыі торфазаводу «Заграшынскі мох», пісала, між іншым, наступнае:

«Уся работа брыгад заводу пераведзена на індывідуальную група вую зьдзельшчыну. Для лепшага кіраўніцтва работай брыгад начальнікамі ў кожнай зьмене падабраны і пастаўлены вытрыманыя, тэхнічна-кваліфікаваныя, лепшыя (падкрэсьлена намі) камуністы. Так, брыгада Навіцкага ўвесь час адставала, а калі на чале яе быў пастаўлен начальнікам зьмены член партыі Лаўшук, які раней працаваў намесьнікам старшыні ТРК, справа пашла ідкіш. Зьмена пачала даваць рэкордныя нормы выпрацоўкі —4.200—4.300, 45.587, 46.000».

Карэспандэнцыя падпісана **Квятновым і Залманавым.** Трэба думаць, што гэты артыкул напярэдадні чысткі парт арганізацыі заводу павінен быў арыентаваць калектыў заводу, дапаматчы камісіі па чыстцы, выхаваць арганізацыю на прыкладах лепшых камуністаў, словам выканаць тую задачу, якую ўсклала партыя на газэты ў часе чысткі. З прыведзенага зусім ясна вынікае, што

1) ўсе цэхі заводу пераведзены на індывідуальна-групавую зьдзельшчыну,

2) што пастаўленыя начальнікамі зьмен **лепшыя** камуністы заводу, у прыватнасьці **Лаўшук,** дабіліся ў сваіх цэхах і зьменах, **пераведзеных на зьдзельшчыну,** рэкордных норм выпрацоўкі.

Артыкул паказвае далей і прыклады дрэнчай работы асобных камуністаў. Усё, як быццам, у артыкуле на месцы. І дрэнныя, і лепшыя камуністы, і падкулачнікі, і клясавыя ворагі...

Але вось праходзіць некалькі дзён. На заводзе пачалася чыстка. У нумары ад 1-га жніўня, праз 9 дзён пасьля прыведзенай карэспандэнцыі, у «Р. П.» зьяўляецца артыкул за подпісам таго-ж Квятнова пад загалоўкам «Носьбіты сабатажу» з пад загалоўкам **«Лаўшук і Мамееў—носьбіты сабатажу».**

Той-жа Квятноў бяз усякага сорому, як «Иван непомнящий», піша наступнае:

«Але сабатажнікі з партбілетамі ў кішэні парашылі для сябе не аба вязковым, непатрэбным выконваць указаньні ЦК, сталі на шлях адкрытага супраціўленьня, увязьненьня дробна-групавой індывідуальнай зьдзельшчыны, патрымліваючы «традыцыі старой арцельнай работы». Лаўшук начальнік зьмены і начальнік агрэгату. Ён павінен быў першы ўвесьці зьдзельшчыну ў сваю зьмену, але... у Лаўшука не няма» і г. д.

А ў нумары ад 2 жніўня ў новай карэспандэнцыі таго-ж Квятнова сказана ўжо ясьней ясьнага:

«Камісія па чыстцы саскабліла іржаўчыну з ячэйкі. Лаўшук — яўны сабатажнік дырэктыў партыі, —з радоў партыі вычышчан».

Такавы **пачатак і фінал** карэспандэнцый, даволі вялікіх па разьмеры, займаўшых відное месца ў газэце, прысьвечаных чысткі заводу, які мае вялікае значэньне ў Рэчыцкім раёне.

Такім чынам, «лепшы» камуніст, які даваў рэкордныя нормы выпрацоўкі ў першай карэспандэнцыі Квятнова, не ратаваў ся ў сабатажніка дырэктыў партыі, у іржаўчыну, у апошняй карэспандэнцыі таго-ж Квятнова.

Што-ж здарылася? А здарылася наступнае. Сабатажніка Лаўшука выявіла камісія па чыстцы партыі, «лепшага-ж камуніста» Лаўшука выявіла ў парадку «дапамоці» камісіі газэта «Р. П.» і не карэспандэнт Квятноў. Мо' дзе небудзь словам спамянута, што першая карэспандэнцыя памылкова? Нічога падобнага. Зачым? 21 чэрвеня Лаўшук быў лепшым камуністам, а 1-га жніўня сабатажнікам. Вось і ўсё. Хіба гэтага ня бывае. Рэдакцыя зусім спакойна. А тое, што такі, з дазволу сказаць, «мэтад» работы дэзарыентуе парткалектыў, рабочых, перашкаджае рабоце па чыстцы, па ўмацаваньні работы заводу—гэта ня цікавіць рэдакцыю.

Спыняемся падрабязна на гэтым «эпізодзе» таму, што характэрны для арганізацыі і асьвятленьня пытаньняў чысткі партыі «Рэчыцкай праўдай» наогул, што гэта зьяўляецца свайго роду **стылем** яе работы.

З прагледжаных за ліпень месяц нумароў «Р. П.» ня сустрэнеш амаль ні аднэй арганізаванай газэтай падборкі, артыкулу, карэспандэнцыі, якія газэта сапраўды-б на-бальшавіцку сур'ёзна і глыбока завастрыла і паставіла-б пытаньні чысткі так, як гэтага патрабуе партыя.

Амаль адзіная, вялікая па разьмерах падборка ад 19 ліпеня, на гледзячы па б'ючыя сваёй сэнсацыйнасьцю загалоўкі (наогул трэба адзначыць вялікую прыхільнасьць «Р. П.» да загалоўкаў такога тыпу, як «Факты абвінавачваюць», «Клубок размотаны», «Нутро засталося тым-жа», «Вывад зроблен» і г. д.),—характэрна поўнай адсутнасьцю **паказу** самой чысткі, **актыўнасьці яе ўдзельніка.**

Напісаныя «па матар'ялах» казённыя, бескаляровыя карэспандэнцыі ў лепшым выпадку даюць біяграфію выяўленых клясавых ворагаў з партбілетамі ў кішэні.

А чысьціцеся-ж ячэйка цэлага сельсавету (Васілевіцкага)! Як добра магла-ж выкарыстаць газэта гэту чыстку для мабілізацыі партыйцаў і калгаснікаў сельсавету на правядзеньне ўборачнай, збожжаздачы і г. д. А з-за няўменьне і нежаданьне арганізаваць матар'ялы не па-казённаму, а так, як гэтага патрабуе партыя, атрымалася сумная інфармацыя аб выключаных і іх характарыстыкі. Таварышы з «Рэчыцкай праўды» забылі аб тым, што задача партыі заключаецца ў тым, каб на аснове падрыхтоўчай работы і самога працэсу чысткі «ўзьняць работу ня толькі кожнага члена партыі паасобку, а па вішна ўзьняць работу ўсіх партыйных арганізацый і зьнішчыць недахопы, якія ёсьць у іх» **(Кагановіч).**

«Р. П.» гэтых задач **не зразумела.** Чыстку на сваіх старонках «Р. П.» не ўзьняла на тую палітычную вышыню, па якой яна павінна быць. Больш таго, рэдакцыя «метадамі» работы сваіх супрацоўнікаў тыну Квятнова,—верхагляду і страчкагонаў, апашляе, кампрамэтуе чыстку, дэзарыентуе арганізацыю, замест дапамогі ёй.

Так, таварышы, з «Р. П.», **факты вас абвінавачваюць...**

Паўдзюк — эскадрыльяю імя Кагановіча

ФАРСАВАЦЬ ТЭМПЫ ЗБОРУ СРОДКАЎ

НА БЯГУЧЫМ РАХУНКУ—362.285 РУБ.

За ўчарайшы дзень па бягучы рахунак паступіла 54.392 рублі. З раёнаў паступіла: Віцебску — 36.532 руб., з Рэчыцы — 1.800 руб., магілеўскага сыяноводтрэсту — 410 р., з Чэрвеня — 1.383 руб.

Як відаць, нарастаньне тэмпаў збору сродкаў яўна незадавальняючае. Асабліва ганебныя вынікі збору ў Рэчыцы і Чэрвені. Ня гледзячы на неаднаразовыя напамінаньні «Зьвязды», да гэтага часу не паступілі сродкі з другіх раёнаў.

За ўчарайшы дзень ад менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў паступіла: ад транспартнага трэсту — 2.462 р., менскай добраахвотнай пажарнай дружыны — 242 рублі, рэспубліканскай школы прафуху — 234 рублі, мецгаркасы — 132 руб., упаўнаважанага фанэрнага трэсту — 54 руб., Кінгацэнтру — 227 руб., навукова-дасьледчага інстытуту — 1274 руб., Белжанторы Ўсекамбанку—86 руб., Белкамунбанку — 345 руб., т-ва «Прыхільнік дзяцей» — 191 руб., Беларускага праўленьня сувязі — 439 р., 22-га аддз. міліцыі — 353 руб., МК СНК — 301 руб., Горнай канторы — 75 руб., нікілеровачнай майстэрні — 31 руб., курсаў ваенкамскладу — 117 руб., вяровачнай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» — 752 руб., Беларускай канторы Скурсанабзбыту — 196 руб., Белкамунспабу — 66 руб., Саюзмаслапраму — 88 руб., заводу «Пралетары» — 202 руб., Белдзяржторфу — 432 руб., арцелі «Чырвоны ўдзельнічык» — 150 руб., бак.-гастр. аб'яднаньня — 112 руб., бульбюро АДПУ— 1779 руб. Усяго паступіла за ўвесь час на бягучы рахунак 362.285 руб.

Дні падрыхтоўкі і правядзеньня дня авіяцыі троба максымальна скарыстаць для фарсаваньня тэмпаў збору сродкаў.

Уносяць і выклікаюць

* Рабочыя і служачыя арцелі «Бальшавік» (Бабруйск) адпрацавалі адзін выхадны дзень, заработак ад якога (600 руб.) перавядзяць на пабудову эскадрыльлі імя тав. Кагановіча і выклікалі пасьледваць іх прыкладу ўсе астатнія арцелі гораду.

* Рабочыя сьнісалцкага сплаўчага вучастку (Асінавіцкі раён) унесьлі на пабудову эскадрыльлі імя тав. Кагановіча 413 рублёў і выклікалі на спаборніцтва Бярэзінскі і Любанецкі сплаўвучасткі.

* Рабочыя сталовай заводу імя Домбаля (Барысаў) уносяць аднадзенны заработак і выклікалі пасьледваць іх прыкладу работнікаў сталовых ЦРК і ЗРК г. Барысава.

* Даярызыгінікі Барысаўскіх лягероў Асаавіяхіму разгарнулі збор сродкаў на пабудову эскадрыльлі імя тав. Кагановіча. Ужо сабрана 163 рублі. Збор працягваецца.

* Работнікі Пухавіцкага райаддзелу сувязі ўносяць у фонд пабудовы эскадрыльлі аднадзенны заработак, што складае 244 рублі і выклікалі пасьледваць іх прыкладу работнікаў райспажыўсаюзу, міліцыі, суд і іншыя установы раёну.

Голуб.

Паўторная чыстка членаў бюро парткалектыву службы эксплёатацыі Віцебскага чыгуначнага вузла

Яркія факты злачынстага супраціўленьня і сабатажу бюракратычных, апартуністычных элементаў правядзеньню ў жыцьцё пастановы партыі і ўраду аб чыгуначным транспарце выяўлены ў парткалектыве службы эксплёатацыі Віцебскага вузла. Паасобныя кіраўнікі — Гадасік (сакратар парткалектыву), **Комель** (начальнік станцыі Віцебск), **Грыгаровіч, Прахаровіч** на адносіне да газэты «Сацыялістычны транспарт» правялі яўны заціск крытыкі і самакрытыкі, правялі яўнае супраціўленьне выкананьню пастаноў ЦК і ўраду.

Адкрытыя апартуністы і сабатажнікі — **Аржанскі і Сьвістуноў** (выключаныя з партыі) не супакоіліся і па-рашэйшаму дзейнічаюць у тым-жа напрамку.

У сувязі з гэтым, віцебская гарадзкая камісія па чыстцы КП(б)Б ухваліла пастанову ячэйковай камісіі аб паўторнай чыстцы членаў бюро парткалектыву службы эксплёатацыі т. т. Гадасіка, Комеля, Грыгаровіча і Прахаровіча. Адначасова віцебская гарадзкая камісія папярэдзіла чыгуначныя прадпрыемствы, што ў іх рабоце павінна быць забясьпечана максымальная дапамога чыгуначнай партарганізацыі ў правядзімай рабоце па перабудове чыгуначнага транспарту, па падрыхтоўцы віцебскага чыгуначнага вузла да асеньня-зімовых перавозак і г. д.

Віцебская гарадзкая камісія падкрэсьліла, што ячэйковыя камісіі разам з правядзеньнем поўнай чысткі павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на тое, як кожны камуніст у паасобку і чыгуначныя ячэйкі ў цэлым не фармальна, а канкрэтна, на справе змагаюцца за перабудову чыгуначнага транспарту.

Пастанова Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю

1. З 20 жніўня г. г. абвясьціць дэкадзнік усебеларускай пераклічкі раёнаў, калгасаў, МТС, саўгасаў і асобных калгасных брыгад аб удзеле іх у сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю за лепшую ўборку і здачу збожжа і інш. с.-г. прадуктаў дзяржаве, аб ходзе спаборніцтва ўнутры раёну, калгасу і ўключэньня ў спаборніцтва за месца на чырвонай дошцы БССР і СССР.

2. Прыпа раёнаў: Гомельскі, Менскі, Барысаўскі, Полацкі, Веткаўскі, Сеньненскі і Камарынскі 20 жніўня праз газэту «Зьвязда» і раённыя газэты арганізуюць узаемаправерку выкананьня дагавораў па спаборніцтву раёну з раёнам, дзеляцца вопытам правядзімага спаборніцтва з паказам лепшых калгасаў, брыгад і саўгасаў, ужываемых імі форм і мэтадаў спаборніцтва.

3. Пераклічка павінна праходзіць пад знакам новага прыліву ў рады ўдарнікаў-калгаснікаў, паказаўшых прыклады бальшавіцкай барацьбы за ўраджай, ударнікаў высокай якасьці ўборкі, абвешчанай «Правдой».

4. Адказнымі ў раёнах за пераклічку зьяўляюцца: РК КП(б)Б (агітпрап), палітаддзелы МТС і саўгасаў (нам. нач. па партмасавай рабоце) і рэдактары раённых газэт.

5. Кіраўніцтва дэкадзнікам пераклічкі ўскладзіці на рэдакцыю газэты «Зьвязда».

Старшыня Цэнтральнай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю А. КАРТУКОЎ.

Старшыні камісіі па чыстцы сураскай райпартарганізацыі тав. Грыцкевічу

Па найўных матар'ялах у Цэнтральным камітэце партыі і Рэспубліканскай камісіі па чыстцы, рад калгасаў вашага раёну, як «Шлях Леніна», «Новы сьвет», Кулікоўскага сельсавету, калгас імя Чарвякова, Пушнякоўскага сельсавету, пад уплывам антыкалгасных элементаў, замест першачарговай задачы збожжа дзяржаве правядзець раздачу збожжа калгаснікам, што адбываецца пры патуранні і сядзейнасьці парт'ячэек і камуністаў.

Прапануецца тэрмінова правесьці паўторную чыстку партячэек указаных сельсаветаў, выключыўшы з партыі вінаватых у дапушчэньні антыдзяржаўных тэндэнцый і як не зрабіўшых для сябе нічых выводаў з чысткі партыі.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б—ЛЫЧОЎ.

ЦЁМНЫЯ СПРАВЫ У КАЛГАСЕ „СЬВЕТЛЫ ШЛЯХ"

(Ліст групы настаўнікаў і калгаснікаў).

У калгасе «Сьветлы шлях» (Новіліцкага сельсавету, Клічаўскі раён) вывілі кулацкае гняздо на чале з Мірановічам Герасімам, яго сабутыльнікі: Руды А., Сазановіч Р., Пляшчук Д. і Пекур М.

Старшыня калгасу Герасім—цьвёрдазаданьнік, былы спэкулянт. Бацька яго буйны кулак і таксама пралез у калгас вёскі Халадок.

Рахункавод кулацкай «бухгальтэрыі»—Пекур, былы спэкулянт і эксплёататар. Ён са сваім братам моў дзьве крамы ў Бабруйску і ў вёсцы Ваевічах, а таксама фальварак у 100 га зямлі, 15 кароў, 6 копай і што год трымаў па 8 батракоў.

Пекур М. запісаўся ў калгас яшчэ ў 1931 годзе, але ў калгас не зьяўляўся, а разбазарваў маемасьць, і ў 1933 годзе, наперакор жаданьню калгаснікаў, старшынёй Мірановічам прымае ў калгас на пасаду рахункавода.

Руды А. забраў абагуленую карову і зарэзаў яе на мяса. Сазановіч Р. прадаў абагуленага жарабца, а Пляшчук Д. прадаў арфу і сячкарню.

Усе гэтыя злачынствы кулацкага ахвосьця, ня гледзячы на пратэсты калгаснікаў, пакрываюцца і замазваюцца Мірановічам.

Акрамя гэтага ў калгасе разбазарваецца масла і малако. Ды і чаму-ж не разбазарваць? Кулацкая «бухгальтэрыя» Пекура пакрые ўсё! Кулачво вядзе сваю агітацыю і не жадае прымаць беднякоў у калгас. Калі бядняка Пац Зося падала заяву аб уступленьні ў калгас, дык яны адхавалі яе, галасавалі супроць і ўнарта не жадалі прыняць...

Пасьля неаднаразовых заяў у сельсавет аб гэтых агіднасьцях, апошні прыслаў сваіх прадстаўнікоў: **Вілсба і Сафраназа.** Сабраўся сход калгаснікаў, дзе пасыпаліся сотні фактаў злачынстай дзейнасьці ў калгасе, але прадстаўнікі сельсавету замест дапамогі калгасу сталі на абарону Пекура і іншых, і пад вялікім напорам калгаснікаў удалося наперакор абаронцам з сельсавету прыняць пастанову толькі аб зьнятьці з рахункаводства Пекура, а ў калгасе ён усё-ж такі застаўся. Прайшло ўжо шмат часу, як адбыўся сход, а Пекур па-ранейшаму «працуе» рахункаводам.

Аб усім гэтым мы сыгналізавалі раённаму пракурору і дасылалі допісы ў райгазэту. Допісы былі зьмешчаны, але справа застаецца па-старому. Кулацкае гняздо не разбурана і працягвае сваю шкодніцкую работу падалей.

МАРКАЎ, СЛАВІНЕЦ І ІНШЫЯ.

УСЯГО 6 ПОДПІСАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае паведамленьня ад Клічаўскага РК КП(б)Б аб тым, што канкрэтна зроблена ў адносінах ачысткі калгасу «Сьветлы шлях» ад клясавых ворагаў, а таксама аб тым, якія меры прынятыя да абаронцаў кулацтва як па сельсавету, так і па раёну.

А. ДЖЭЛЮК, Г. МАЛІКІН

У ДРУЖБЕ З КУЛАКОМ

У Камарынскім раёне ня ўлічылі новых абставін і новых мана ўраў клясавага ворага. За дэкларацыйнымі гучнымі фрасамі, якія сыпаліся ад кіраўнікоў раённых арганізацый, кулак, былы балаховец, прыпісваевец, вэсэр спакойна, беспакарана арудваді.

Возьмем хоць-бы гісторыю з прысядзібнымі землямі. У раёне ў значнай частцы калгасаў прысядзібныя землі складаюць ад 1 да 3 гэктараў. Ёсьць выпадкі, што ў «калгасьніка» апрача вялікіх «гародных» вучасткаў аймі ёсьць і рабочая жывёла — коні, валы і г. д. Кулаччо, карыстаючыся прытупленьнем бальшавіцкай пільнасьці раённага кіраўніцтва, у гэту вясну самачынна захватвала калгасныя землі і засявала іх. Так было ў калгасах «Чырвоны барацьбіт», «Дняпроўскі ораты», імя Варашылава, «Інтэрнацыянал» і інш. Часта можна сустрэць у Камарыне такіх калгаснікаў, якія маюць на сваёй «гародняй» зямлі цэлую систему палявой гаспадаркі. Напрыклад, у калгасе «Чырвоны барацьбіт» калгаснік Хмялёнам Міхась засеяў: ячменю 0,15 га, пшаніцы — 0,13 га, ільну — 0,08 га, пянькі 0,06 га, бульбы — 0,026, гароду — 0,06 і жыта — 1,7 гэктара. Мэнэуш Адам засеяў пянькі 0,05 га, бульбы — 0,6, гароду — 0,02, жыта — 1,19 га. Такія-ж, прыкладна, пасевы маюць у гэтым калгасе і рад іншых калгаснікаў: Шам, Канцавы, Пацюк, Пархомец, Гапка, Яфіменка і іншыя.

Праведзены выбарачны абмер у калгасе «Інтэрнацыянал» паказаў, што там клясавага праізмерна раздуты прысядзібныя землі. Напрыклад, калгаснік Скідан засеяў: жыта — 0,55 га, ячменю — 0,12, бульбы — 0,24, гароду — 0,3, проса — 0,65 га.

Раённыя кіраўнікі часта дапускаліся, чаму ў значнай частцы калгасаў такая нізкая прадукцыйнасьць працы. Яны шукалі прычын адставаньня раёну ў часе веснавой сяўбы, выносілі гучныя разалюцыі, але ад гэтага не станавіліся лягчэй. У значнай частцы калгасаў былі вінаваты на работу, была зла чынна нізкая якасьць апрацоўкі глебы.

Кулак агітаваў за тое, каб у першую чаргу засяваць свае прысядзібныя землі, каб ня выходзіць на палявую калгасную работу, і трэба сказаць, што яго падрыўная работа мела ўплыў на менш устойлівыя пласты калгаснікаў.

Ва тры вярсты ад раённага цэнтру, у калгасе «Дняпроўскі ораты» кулаччо, якое засела ў праўленьні калгасу на пасадах брыгадзіраў, рахункаводаў, сьвядома праводзіла шкодніцкі засеў аўса і ячменю непратручаным насеньнем. У іншых калгасах былі выпадкі пасеву бульбы ў аднавор.

Усё гэта тварылася на вачох раённага кіраўніцтва. Раённыя кіраўнікі не магалі як сьлед змагацца з захватам калгасных зямель, бо самі яны ў тэй ці іншай меры былі замешаны ў гэтым. Былы сакратар РК Кавалёў на землях лугласу сілямі рабочых засеяў зяўзі пагэктара бульбы. Тое-ж самае рабілі і іншыя раённыя работнікі.

Бездапаможнасьць, якая перарастае ў шкодніцтва, дайшла да таго, што райвіз і па сёньняшні дзень не правёў закону ўраду аб устаноўленьні цьвёрдага зямлякарыстаньня калгасаў. Гэта яшчэ больш разьвязала кулацкім элементам рукі. У выніку таго, што няма цьвёрдых межаў калгасных зямель, кулаччо агітавала за самачынны захват зямель, якія належаць калгасам. У радзе калгасаў так і атрымалася, што калгасныя землі засяваліся як калгаснікамі, так і аднаасобнікамі. Сярод іх была значная колькасьць і цьвёрдаздатчыкаў. Засеяныя калгасныя землі як калгаснікамі, так і аднаасобнікамі ўтойваліся ад абкладаньня пры давядзеньні абавязацельстваў на дзяржаўныя пастаўкі.

У раёне і зараз спрачаюцца і ня могуць знайсьці канцоў, колькі-ж у іх складаюць пасеўныя плошчы. Пляны мінуюцца, як пальчаткі. Узяць хоць-бы выпадак з пасеўнымі плянамі гэтага году. Раён даў весткі ў цэнтр, што на раёну налічваецца ворных зямель пад пашы клін 9.000 га, Наркамзем зацьвердзіў плян пасеву ў 10.000 га, потым у раёне «адумаліся» і парашылі, што ў іх ёсьць зямлі ня 9, а 12 тыс. га і, урэшце, засеялі 11.562 га. Такім чынам, агульны плян пасеў ай плошчы раёну і зараз толькі прыблізны. Ніхто ў раёне ня можа сказаць цьвёрда, колькі ёсьць зямель, якія лічацца за калгасамі і за аднаасобнымі гаспадаркамі.

Ці варта-ж гаварыць пасьля гэтага, што такая «сыстэма» стварыла глебу для беспакаранага захвату калгасных зямель кулацкімі элементамі і утойваньня іх ад паставак.

Празьмерна раздутыя прысядзібныя землі зьявіліся асноўным тормазам у правядзеньні веснавой сяўбы і ў выкананьні іншых гаспадарча - палітычных кампаній. Лепшы час для сяўбы падкулачнікі скарыстоўвалі для засеву сваіх вучасткаў. Яны-ж на гэта падбухторвалі і добрасумленных калгаснікаў. У калгасе імя т. Варашылава былі факты, калі кулакі, якія пралезьлі ў калгас, адкрыта сабатавалі веснавую сяўбу, прапоўку і ворыва папараў. Калі дакапаліся, у чым справа, то выявілася, што ў большасьці калгаснікаў прысядзібныя землі складаюць ад 2 да 3 гэктараў. Карацей кажучы, калгас зьяўўся шырмай, за якою кулак беспакарана арудваў.

Засьмечанасьць калгасаў клясава-чужымі, эсэраўскімі, бандыцкімі і іншымі антысавецкімі элементамі ў раёне кадзявчай вялікая. Пад носам у раённага кіраўніцтва ў калгасе «Дняпроўскі ораты» праўленьне складалася з кулакоў і падкулачнікаў. Там у шырокрытай форме рабіліся крымінальныя справы, браліся пад абарону кулакі і выцяскалася беднота з калгасу. Старшыня праўленьня Баброўнік агрупаваў праўленьне выключна са сваіх сваякоў. Гэта кулацкае праўленьне ўсялякімі сіламі імкнулася не дапусьціць новага прыліву ў калгас. Новаўступаючых яны цкавалі.

Кулацкія элементы ўхітраліся даяліць штучна свае гаспадаркі, каб выкруціцца ад цьвёрдых заданьняў. Старшыня калгасу Баброўнік арабіў фіктыўны падзел сваёй гаспадаркі. Жонка і астатнія члены сям'і вялі індывідуальную гаспадарку, а Баброўнік, будучы ў калгасе, ухітраўся засяваць для сябе дадатковыя пасевы. Ён засеяў для сваёй ко карыстаньня больш чым адзін гэктар жыта і поўгэктара бульбы. Гэтыя пасевы засяваліся рабочай сілай калгасу. Па прыкладу яго рабілі такія-ж фіктыўныя падзелы і іншыя члены праўленьня.

Яны, акрамя сваіх індывідуальных гаспадарак, рабілі індывідуальныя засевы на калгасных палёх і утойвалі гэтыя плошчы ад сельгаспаставак. Больш таго, кулаччо з мэтай выклікаць неадаволеньне сярод калгаснікаў разьмяркоўвала прысядзібныя землі так, што сабе брала найбольш лепшыя і тэрытарыяльна больш выгодныя вучасткі, а беднаце адводзіла гароды далёка ў полі і на горных землях.

Пад простай абаронай перарадженцаў кулаччо вяло лінію на развал калгасу «Чырвоны барацьбіт». Сярод калгаснікаў можна сустрэць прозьвішчы кулакоў і арэндатараў. Напрыклад: **Шыпіла Міхась** — ёсьць старшыні сельсавету члена партыі Шэўчанкі, да ўступленьня ў калгас меў 15 га зямлі, 12 шт. буйнай рагатай жывёлы, 8 сьвіней

БЕСЬПЕРАБОЙНА ВЕСЬЦІ УБОРКУ І ПЕРШАПАЧАТКОВУЮ АПРАЦОЎКУ ІЛЬНУ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ РАСОНШЧЫНЫ ПАВІННА НАНЕСЬЦІ ЗНІШЧАЛЬНЫ ЎДАР ПА КУЛАЦКІХ І ШКОДНЫХ ТЭНДЭНЦЫЯХ САПСАВАЦЬ ІЛЬНАПРАДУКЦЫЮ. БЯЗЬЛІТАСНЫ АГОНЬ ПА НОСЬБІТАХ АНТЫМЭХАНІЗАТАРСКІХ НАСТРОЯЎ

Не ўзначалілі барацьбу за тэмпы і якасьць уборкі і апрацоўкі ільну

РАСОНЫ (Наш спэцкор.).

Яшчэ 25 ліпеня расонскі райком партыі і РВК вынесьці вельмі дзелавую пастанову аб уборцы і пераапрацоўцы ільну. Вынесьлі і на гэтым супакоіліся. Пачалі чакаць, калі на склады пойдзе лён, ды яшчэ добрай якасьці. Як дайшла пастанова да сельсаветаў, ячэек, калгасаў, бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, аднаасобнікаў і як яна выконваецца ў раёне ня лічылі патрэбным правяраць.

Уборка ільну пачалася, а церабільныя агрэгаты (трактар і дзьве церабілкі) ні на адным вытворчым вучастку ня былі створаны. Ніякіх маршрутаў ільнаўборачных і ільнапераапрацоўчых машын ня было ўстаноўлена. Вучасткі з высокім ільном для церабілак ня былі таксама вызначаны.

Нічым не адзначыў свайго ўдзелу ва уборцы і пераапрацоўцы ільну і райком КСМ. Камсамольская арганізацыя, якая налічвае 450 чалавек, не мабілізавана на барацьбу за лён. У свой час райком склікаў нараду сакратароў ячэек, на якой таксама гаварылі аб уборцы ільну. Але і тут сьледам за РК і РВК, пагаварыўшы, таксама супакоіліся. Камсамольская арганізацыя ня прымае ніякага ўдзелу ў барацьбе са стратамі і ў ахове калгаснага ўраджаю. «Шэфства над церабілкамі «Камсамолка»,—як гаворыць сакратар райкому КСМ—мы наогул узялі, а ў прыватнасьці не». Плян прымацаваньня ячэек да церабілак райком пачаў складаць толькі праз 10 дзён пасьля таго, як калгасы пачалі церабленьне ільну.

Да чаго прывяла замена жывога і канкрэтнага кіраўніцтва цыркулярамі і агульнымі разважаньнямі — праілюструем фактамі з работы двух сельсаветаў **Сакалішчанскага і Клясіцкага**, на тэрыторыі якіх знаходзіцца 26 калгасаў, абслугоўваемых двума вытворчымі вучасткамі МТС. Да рэчы адзначым, што раённымі арганізацыямі гэтыя сельсаветы і вытворчыя вучасткі былі рэкамандаваны, як самыя лепшыя.

Якасьць і барацьба са стратамі—забыты вучастак

Друкуемы намі сёньня матар'ял аб ільназаводзе і райканторы Загатлён выстарчальна паказвае, да чаго прывяло ігнараваньне якасьці ігры ўборцы і пераапрацоўцы ільну ў мінулым годзе. Церабленьне ільну сёлета ў раёне пачалося 1 жніўня. Між тым, як паказвае практыка работы на тэрыторыі **Сакалішчанскага і Клясіцкага** сельсаветаў, зараз паўтарасьца леташняя справа. Уборка і пераапрацоўка праходзіць самацёкам, бяз усякага кіраўніцтва і кантролю з боку раённых арганізацый. Пры гэтым ніякія правілы агратэхнікі ня выконваюцца. У рэзультаце паўстае рэальная пагроза, што на дзяржаўныя склады можа пайсьці сырэц ніякай якасьці. У большасьці калгасаў праводзяць церабленьне замест двух раз адзін раз. Як правіла, лён не сартуецца—**доўгі і кароткі вяжуцца ў адны снапы.** На ільнянішчах застасьцца вялікая колькасьць ня вырванага ніякага ільну. Вырваны на пробу лён з аднаго квадратнага мэтра ў калгасах **«Чырвонае вусьце», «Расоны», «Бел. батрак»** (Клясіцкага сельсавету) і інш. у пераводзе на ільнасемя паказаў, **ШТО НА ПОЛІ ЗАСТАЕЦЦА НЯ МЕНШ АДНАГО ЦЭНТНЭРА СЕМЯ З АДНАГО ГА. Ачос галовак праводзіцца па-шкодніцку. Амаль ва ўсіх калгасах узялі за правіла, каб падраўняць снап, касой падразаць галоўкі ў снапох. У выніку, там дзе лён — зьвязан не сартаваным, траціцца самая лепшая частка ільну. Для таго, каб падраўняць снап, у калгасе «Чырвоная Сакалішча» і інш. абразаюць да 10-15 сант. сьцябла.** Аб тым, што абмалот галовак збожжамалатарням мі забараняецца ня ведае ні адзін калгас. На пытаньне, чым думаеце малаціць семя, усюды чуцен адзін адказ: «збожжамалатарнямі». Гэты прыклад паказвае раённым арганізацыям, што мала пісаць цыркуляры, але трэба канкрэтна кіраваць калгасамі. Ня гледзячы на тое, што пастановай быў забаронен абмалот збожжавымі малатарнямі, усё-ж кулацкія элементы імкнуцца пашкодзіць калгаснай вытворчасьці.

Характэрна, што ўся гэта кулацкая работа праводзіцца пад прадлогам датэрміновага выкананьня загатовак ільну. У сапраўднасьці-ж гэта пагоня за тэмпамі ёсьць нішто іншае, як рвацтва 1 жаданьне выгнаць больш працадзён у шкоду калгаснай вытворчасьці. Гэтыя факты маюць месца ня толькі ў аддаленых калгасах, але нават у тых, якія знаходзяцца пад бокам раённага цэнтру (калгас «Альбрэхтава»). Такім чынам, барацьба за якасьць ільну ў першыя-ж дні ўборкі пастаўлена на задні плян.

Усё гэта адбываецца выключна таму, што раённыя арганізацыі не падрыхтаваліся да ўборкі і пераапрацоўкі ільну, што ў рабоце існуе практыка чарговасьці с.-г. кампаній. Сканцэнтраваўшы галоўную ўвагу на збожжазагатоўках, раённыя работнікі на мясцох на ўвязваюць гэтай работы з іншымі с.-г. кампаніямі.

Носьбіты антымэханізатарскіх настрояў не атрымліваюць адпору

Але горш за ўсіх працуе МТС. Трэба адзначыць, што раённыя арганізацыі пераацанілі сілы МТС і прадставілі ёй поўную самастойнасьць, не аказваючы ніякай дапамогі ў рабоце. У рэзультаце МТС не змагла нават арганізаваць правільнае скарыстаньне паўўных уборачных і ільнапрацоўчых машын. Толькі ў самы разгар уборкі МТС даводалася, што ёй не хапае 200 мэтраў пасаў да машын. ГІЛЬШТЭЙНА і толькі 4 жніўня пачала шукаць гэтыя пасы на месцы. Аднак, пасаў няма. Машыны не праверены. Для работы на іх ня вылучаны людзі. Амаль усе 19 машын ГІЛЬШТЭЙНА стаяць без работы. Так, па Клясіцкім вучастку з чатырох машын працуюць толькі 2. Па Сакалішчанскім з 13-ці ні адна не працуе. Характэрна, што на пытаньне да ільнавода ў калгасе «Чырвонае Сакалішча», чаму ён дапусьціў абрэзку касамі ільняных снапоў, быў такі адказ: «Мы ня ведалі, што МТС дасьць нам для ачосу галовак машыны». А ў той-жа час у гэтым калгасе на складах стаяць 3 машыны Гільштэйна бяз пасаў.

Яшчэ горш скарыстоўваюцца ільнацерабілкі, хутчэй яны зусім не скарыстоўваюцца. Па даных МТС, з 41 церабілкі лічылі працаваўшымі 12 штук, у тым ліку 4 па Сакалішчанскаму сельсавету. На самой-жа справе аказалася, што з гэтых чатырох церабілак ні адна не працуе, а дзьве з іх пасьпелі ўжо зламаць. Такім чынам, даведка МТС выклікае вялікае сумненьне. У калгасах Сакалішчанскага і Клясіцкага зыт вочных вучасткаў прабавалі пускаць церабілкі ў ход, але праз паўгадзіну—гадзіну іх ставілі на сваё месца, гаворачы «ня ідзе». Такі адказ чуен амаль ва ўсіх калгасах. Гэтая нічым чым прыкрытая хлусьня не атрымлівае з боку раённых арганізацый рашучага адпору. Аказваецца, церабілка працуе вельмі добра, але ня рве ільну толькі таму, што яе пускаюць на вучастку бяз усякага разбору. Вядома, што пры такіх адносінах да машыны церабілка ніякі лён ня будзе рваць, а толькі папсуе яго. Вылучыць-жа лепшыя вучасткі з высокім ільном у калгасах не здагадаліся, а работнікі вытворчага вучастку нават і не дабіваюцца гэтага. У рэзультаце па Сакалішчанскім вучастку стаяць без работы 9 церабілак і па Клясіцкім—3. Такім чынам сваёй бяздзейнасьцю МТС фактычна патурае антымэханізатарскім тэндэнцыям.

Аб палепшаным пскоўскім спосабе апрацоўкі „ня чулі"

Недапушчальна ігнаруецца пастанова пленуму ЦК КП(б)Б аб апрацоўцы 30 проц. ільну ў мачанцовых раёнах пскоўскім палепшаным спосабам. Сутнасьць гэтага спосабу заключаецца ў тым, што вырваны лён у той-жа дзень павінен быць ачосан і замочан. Пры гэтым спосабе для мачэньня ільну до сыць 3-х дзён і для лёжкі 7 дзён. Такім чынам, праз 14-15 дзён траста можа быць здана дзяржаве, тады, як разрыў паміж церабленьнем і мочкай знач на падаўжае ўсе наступныя працэсы пераапрацоўкі. Аднак, аб гэтым мерапрыемстве ня толькі калгасьніні ня ведаюць, ня ведаючы, у чым яго сутнасьць, але ня ведаюць і самі раённыя работнікі. Так, усе работнікі **Сакалішчанскага і Клясіцкага** вытворчых вучасткаў і 7 старшынь калгасаў не далі адказу, як трэба апрацоўваць лён палепшаным пскоўскім спосабам. У гэтым часткова і крыецца сакрэт, чаму ў раёне ўжо намеціўся пэўны разрыў паміж уборкай і першапачатковай пераапрацоўкай і сакрэт таго, чаму не скарыстоўваюцца машыны Гільштэйна. Апрача таго, райком і РВК у сваёй пастанове ўстанавілі мінімальны плян нагрузкі на машыну Гільштэйна. Для кожнай машыны ўстаноўлен плян ачосу за сэзон 30.000 снапоў, тады, як дзённая прапускная здольнасьць аднэй машыны—4.800 снапоў. Выходзіць, што машыны будуць працаваць толькі 6-7 дзён. Але калі-ж пачнуцца гэтыя 6-7 дзён і будуць пушчаны ў ход усе машыны Гільштэйна—усё яшчэ невядома.

* * *

Раённыя арганізацыі як сьлед не узяліся за работу па першапачатковай апрацоўцы ільну, ня ўключыліся ў барацьбу за якасьць уборкі гэтай важнейшай культуры. З-за адсутнасьці канкрэтнага кіраўніцтва і рашучай барацьбы з антымэханізатарскімі тэндэнцыямі намеціўся ільны разрыў паміж церабленьнем і першапачатковай апрацоўкай ільну. А гэты разрыў ёсьць просты ўдар па якасьці ільнапрадукцыі, удар па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў... У рэзультаце шкодная рвацтва і дзяржава і калгасам напосяцца вялікія страты. Якасьць уборкі і пераапрацоўкі яўна ігнаруецца і ставіцца на задні плян.

Уборку раньнята ільну ў раёне можна лічыць закончанай (пасеяна 200 га), а 10 толькі калгасамі выцераблена 270 га. Калгасы прыступілі да ўборкі сярэдніх пасеваў, плошча якіх складае 2.200 га. Між тым, выцераблены лён у большасьці калгасаў стаіць на полі. Далейшыя працэсы апрацоўкі пачынаюцца а вялікім спазьненьнем. А некаторыя калгасы нават думаюць пачаць пераапрацоўку пасьля таго, як будзе выцераблены ўвесь лён. Для ачосу галовак—першага працэсу пасьля церабленьня—ручным спосабам, выначаецца вельмі малая колькасьць мужчын, ня больш 3-4 чалавек.

Абавязак раённых арганізацый—забясьпечыць карэнны пералом у адносінах калгасьнікаў да якасьці ўборкі і пераапрацоўкі ільну, што ў рабоце існуе практыка чарговасьці с.-г. кампаній. Сканцэнтраваўшы галоўную ўвагу на збожжазагатоўках, раённыя работнікі на мясцох на ўвязваюць гэтай работы з іншымі с.-г. кампаніямі.

Носьбіты антымэханізатарскіх настрояў не атрымліваюць адпору

Але горш за ўсіх працуе МТС. Трэба адзначыць, што раённыя арганізацыі пераацанілі сілы МТС і прадставілі ёй поўную самастойнасьць, не аказваючы ніякай дапамогі ў рабоце. У рэзультаце МТС не змагла нават арганізаваць правільнае скарыстаньне паўўных уборачных і ільнапрацоўчых машын. Толькі ў самы разгар уборкі МТС даводалася, што ёй не хапае 200 мэтраў пасаў да машын. ГІЛЬШТЭЙНА і толькі 4 жніўня пачала шукаць гэтыя па-

„...абавязацельствы здатчыкаў ільну і пянькі дзяржаве будуць лічыцца выкананымі толькі пры ўмове здачы дзяржаве ільну і пянькі якасьцю ня ніжэй прадугледжанай дагаворам" (З пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б)

Чаму не працавала машына Гільштэйна

Калгас «XIII Кастрычнік», Клясіцкага сельсавету, налічвае ўсяго 26 двароў. Гэты калгас, на чале якога стаіць тав. Хахіль, скарыстоўвае ўсе магчымасьці, каб паскорыць уборку і здачу дзяржаве прадукцыі. Тут калгасьнікі прытрымліваюцца таго правіла, што машына пакуль ідзе на дапамогу чалавеку, а не наадварот... Выходзячы з гэтай зусім правільнай устаноўкі, калгас арганізаваў уборачныя работы. Рабочая сіла і інвэнтар у калгасе расстаўлены так, каб не дапусьціць перастою ўраджаю на кадню, сваячасова ўбраць яго і захаваньнем усіх правіл агратэхнікі. Каб убрацы збожжавыя ў стадыі васковай сьпеласьці, вылучана 9 жней і адна жнівярка. Побач з уборкай вядзецца работа па загатоўцы і здачы збожжа дзяржаве. Тут не чакаюць, пакуль збожжа высахне ў полі. Жатыя снапы з лепшых вучасткаў звозяцца ў асець, дзе сушацца пры дапамозе спэцыяльных печак.

На працягу першых трох дзён уборкі было высушана 4 з паловай капы жыта і акалочана 147 кгр. самага лепшага і сухога зерня. 6 жніўня па стаўлены на сушку яшчэ 4 з паловай капы. Збожжа ад першай сушкі здана на расонскі склад Загатзбожжа і ссыпана ў засек № 1 (жыта ссыпаецца ў тры засекі, у залежнасьці ад яе вільготнасьці). Збожжа калгасу «XIII Кастрычнік» ссыпана ў засек, дзе захоўваецца самае лепшае збожжа, так званае **«асотнае»**.

Асаблівай увагай карыстаецца і вядучая культура калгасу — лён. 16 га ільну калгас паставіў задачай убрацы у мінімальна кароткія тэрміны і правесьці першапачатковую апрацоўку яго канвэерным спосабам. Калгас змагаецца за тое, каб датэрмінова пераапрацаваць і здаць дзяржаве прадукцыю сустрэчнай якасьці. Па заданьні калгас павінен здаць 7,48 цэнтн. валакна 8-га нумару, 40 цэнтн. трасты, сярэдні нумар 1,4 і 11,15 цэнт. семя. Але калгасьнікі гэтым не абмяжоўваюцца, яны вядуць барацьбу за тое, каб гэтыя паказальнікі перавыканаць. Для ўборкі ільну вылучана 13 жанчын, з якіх арганізаваны 3 звяны. Церабленьне пачалося 5 жніўня, а 15-га калгас думае закончыць уборку, ачос, мочку і пачаць расьціл ільну.

Каб здаць прадукцыю высокай якасьці, пры церабленьні праводзіцца сартыроўка. Для гэтага ў кожным звяне вылучаны двойкі, якія разьлічаны на першы і другі нумар. Першы нумар рве і вяжа ў снапы лён высокі, а другі—ніякі. Такім чынам лён атрымліваецца двух гатункаў. За першыя тры дні **ўжо выцераблена 4 га,** а трэба было па заданьні **3,9 га.** Асабліва праяўляюць сябе калгасьніцы-церабільшчыцы **Караткова** Жэня і **Шызьдзер** Прасьня (удзельніца раённага зьлёту ўдарнік).

Усьлед за церабленьнем праводзяцца наступныя працэсы: ачос галовак і мочка. Якраз на гэтым адказным вучастку першыя два дні калгасу прыйшлося трымаць экзамэн на аўладаньне тэхнікай машын.

Па чутках, калгасьнікі і старшыня калгасу **Хахіль** ведаюць, што пры мачанцовым спосабе апрацоўкі лён атрымліваецца самай лепшай якасьці, калі ў той-жа дзень выцераблены лён будзе ачосан і замочан (так званы палепшаны пскоўскі спосаб). Калгасьнікі парашылі зьвярнуцца за дапамогай да МТС. 6-га жніўня пад вечар Клясіцкім вучасткам МТС была прыслана ў калгас машына Гільштэйна і трактар. Калгасьнікі былі ўпэўнены, што машына ім дапаможа стаць у рады перадавікоў у барацьбе за лён. Разьлік быў такі: увесь выцераблены лён апрацоўваць палепшаным пскоўскім спосабам. Аднак, першыя паўтары дні надзеі на машыну не апраўдалі. Машына ў калгас была прыслана неадрэгуляванай.

У першы час не працавалі зажымы, снапы з зажымаў вырывала зубцамі і ператварала лён у мачалу. Прычына?—Кімсьці быў апушчан ролік зажымаў і яны не працавалі. Пад нялі ролік, зажымы пачалі працаваць. Але машына 1-2 мінуты працавала, а 5-10 стаяла. Снапы па-ранейшаму вырывала, да таго яшчэ пачалі гнуцца і ламацца зубы барабана. Кожныя пяць мінут прыходзілася адгінаць і ставіць іх на сваё месца. Для гэтай мэты нават быў пастаўлен спэцыяльны чалавек з сякерай, які адгінаў зубы. Адзін зуб вылцеў, пачалі шукаць чым замяніць яго. Аказалася, што з машынай ня прыслана ніякіх запасных частак. Так цягнулася да 12 гадзін дня 7 жніўня. Каля машыны скапілася гара снапоў з галоўкамі, чакаючых сваёй чаргі. Падвозчык спакойна падвозіў з поля яшчэ воз за возам, а ў мачыла ня было чаго вазіць.

Так прапрацавалі дзьве гадзіны **6** жніўня і з 6 раніцы да 12 дня 7 жніўня. Падвялі вынікі: за 8 гадзін работы ачосана 10 коп, працавалі 4 чалавекі, спалена 24 кгр. гаручага. Усе паказальнікі і факты супрэць мэханізацыі, далкам апраўдваюць кулацкую агітацыю.

Пра машыну пачалі гаварыць рознае. Але тав. **Хахіль** быў аднэй думкі—машына павінна працаваць і даць поўную выпрацоўку. Роўна ў 12 гадз. дня па яго распараджэньні і пры яго актыўным удзеле было адкінута на бок некалькі снапоў і з кожнага зроблена па два, а з некаторых па тры снапы. Снапы, якія мелі ў дыямэтры 25-30 сантымэтраў, пачалі перавязваць і рабіць па 10-15 сант. Такіх зьменшаных снапоў было зьвязана 5. Працэсы ці на пробу Рэзультат—машына ні разу ня спынілася. Калгасьнікам стала ясна, што прычына ў таўшчыні снапа. Ясна стала, што тоўсты снап псуе зажымы, гне і ламае зуб барабана. Усім таксама стала відавочна, што справа не ў машыне, а ў людзях. Аб гэтым сказаў пробны час работы са стандартным снапом. За **адну гадзіну** было прапушчана 8 коп. Пры такой выпрацоўцы ня толькі забясьпечваецца канвэерная пераапрацоўка, але ёсьць пагроза, што церабільшчыцы ня будуць пасьпяваць за машынай.

Машына пачала працаваць амаль нармальна. Адзіным затрыманьнем аказваўся пас другога барабана. **Клясіцкі** вучастак МТС—на чале якога быў тав. **Багданаў**—адзначаецца безгаспадарчымі адносінамі да машын. Безгаспадарчасьць і была прычынай таго, што скідваўся пас. Пас павінен прыкрываць шчыток, інакш снап будзе чапляць і скідваць яго. Але шчыток недзе згінуў. Прышлося прыбіць драўняны кол замест яго, і пас пачаў працаваць, ня выклікаючы затрыманьняў.

Па апошніх вестках, церабільшчыцы калгасу «XIII Кастрычнік» вяжуць снапы ільну не таўсьцей 10-15 сант. Пачынаючы з 5 і па 10 жніўня ўжо выцераблена 9 га ільну. Каля машыны няма запасу снапоў. Ільняны канвэер ідзе поўным ходам. Лён бесьперабойна паступае ў мачыла, а дзяржаве рыхтуецца датэрміновая здача высокаякаснага сырцу.

* * *

З прыведзеных фактаў даволі відаць, чаму ў калгасе «XIII Кастрычнік» машына Гільштэйна адразу не пайшла. У гэтым вінаваты непасрэдна работнікі МТС, і ў першую чаргу работнікі **Клясіцкага** вытворчага вучастку, якія яўна ігнаруюць лёзунг тав. **Сталіна** аб аўладаньні тэхнікай. Ня гледзячы на тое, што ў раёне скончана чыстка парт'арганізацыі, некаторыя работнікі не зрабілі адпаведных вываадаў з леташняй практыкі кулацкіх антымэханізатарскіх настрояў. Напрыклад, былы загатчык **Клясіцкага** вучастку **Багданаў** (зараз працуе на Сакалішчанскім вучастку), член КП(б)Б, на заданае яму пытаньне, якога размеру павінен падавацца снап у машыну Гільштэйна, толькі паціснуў плячыма і сказаў: «ня ведаю». Мы пытаемся: ну, калі ня ведаеш сантымэтраў, пакажы рукамі! Ён, ніколькі не саромячыся, паказвае снап, таўшчынёй у 25 сант. Вось гэта работа «на вока», нежаданьне авалодваць тэхнікай машыны і вядзе да дыскрэдытацыі ў вачох калгасьнікаў мэханізацыі сельскай гаспадаркі, грае на руку кляса саваму ворагу, які імкнецца сарваць уборачную і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

ПСКОЎСКІ.

Не паўтараць мінулагодніх памылак

Зайдзеце да дырэктара расонскага ільназаводу тав. **Мальг** і пачнеце гутарку аб выкананьні заводам вытворчай праграмы. Вы пачуеце з яго вуснаў: «дрэнна». Бясспрэчна, дрэнна—праграма ня выконваецца, ні якасна, ні колькасна. Стоячы ля ільняной турбіны ў гэтым можна ўпэўніцца.

Вось праходзіць партыя трасты, памятая вальцамі праз першы трапальны апарат. Падыходзіць да другога. Але перш чым лён патрапіць у другі апарат, палова яго падае на праходзячы ўнізе канвэер, які падае ўпаўшае ў кудзельны цэх, як турбінныя адыходы.

І так, бязупынна ідзе канвэер, а лён усё падае і падае.

Тут, на ільняным канвэеры, фіксуюцца ўсе недахопы і мімаволі прыму шаюць успомніць урокі леташняй загатоўчай кампаніі. Тое, што ня было зроблена па полі ў мінулым годзе, зараз дарабляе канвэер турбіны. Каротку трасту выкідае, а з доўгай дае валакно. І ня дзіва, што ён выконвае сваю праграму на 180 проц., за тое трапальныя апараты даюць 75 проц. пляну. Турбіна дае больш адыходаў і менш поўнацэннай прадукцыі.

— Прычына адна—тлумачыць тав. **Мальг.**—У мінулым годзе лён па полі не сартавалі. Лён рознай даўжыні вязалі ў адны снапы. Вось і выходзіць, што турбіна скарыстоўваецца напалову як кудзельная машына.

Сапраўды, пытаньні якасьці пры ўборцы і першапачатковай пераапрацоўцы ільну летась у раёне былі пастаўлены на задні плян. Аб гэтым сьведчаць і такія факты, калі замест 85 проц. турбіннай трасты было загатоўлена толькі 15. Да гэтага трэба дадаць, што ў пэрыяд мочкі і расьціл ду была дапушчана безгаспадарчасьць; у рэзультаце і доўгая траста аказалася ніякай якасьці.

Так, гэта было ў мінулым годзе. А што зараз робіцца, каб не паўтарылася леташняя практыка?

— Ды нічога,—ніколькі не саромячыся адказвае дырэктар.

Завод сапраўды нічога не зрабіў і ня думае зрабіць, а дырэктар сядзіць і літаральна чакае ў мора пагоды. Пры цяперашнім стане падрыхтоўкі заводу калгасы вымушаны будуць везьці трасту, ня ведаючы—прымае яе завод, ці не. Ні ў адзін калгас не пасланы ўзоры трасты. Людзі на мясцох не праінструктаваны. Нічога ня зроблена, каб на месцы ў калгасах акрэсьліваць якасьць ільну, прызначанага для ільназаводу. На заводзе ня ма сартоўшчыка. Паяўная адна шаха з дахам закідана трастой мінулага году. Другая шаха, ёмістасьцю ў 600 тон цалкам гатова, але бяз даху. Ільнакапляводбуд пачаў пабудову гэтай шахі яшчэ ў 1931 годзе, засталося толькі накрыць яе, але чамусьці гэта работа не праводзіцца. У рэзультаце трасту новага ўраджаю прыдзец ца складаць пад адкрытым небам. Так стаіць справа з цэнтральным расонскім заводам.

Акрамя таго, у раёне ёсьць яшчэ два заводы—шуляцінскі і сяргіеўскі, загадзяньне якімі ўскладзена на тав. **Мальг.** Усе тры заводы павінны загатовіць 2.600 тон трасты, у тым ліку 70 проц. турбіннай і 30 проц. кудзельнай. Але фактычна астатнімі двума заводамі ніхто ня кіруе. Тав. **Мальг** увесь час скардзіцца на перагрузку і адсутнасьць калраў, сродкаў і г. д., а сам нічога ня робіць. У рэзультаце ільназаводамі нічога ня робіцца для таго, каб лепш арганізаваць загатоўкі трасты і паступленьне яе лепшай якасьці.

З другога боку, раённая кантора загатільну (загадчык тав. **Савіцкі**) толькі тое і ведае, што складае шыракавяшчальныя дэклярацыі. Масы калгасьнікаў і працоўныя аднаасобнікі не мабілізаваны на выкананьне плянаў загатовак і пераапрацоўкі ільну. Калі некаторыя перадавыя калгасы па сваёй ініцыятыве праводзяць рад мерапрыемстваў, каб хутчэй і лепш правесьці ўборку і пераапрацоўку ільну, то па аднаасобным сэктары справа абстаіць значна горш. З імі ніякай работы не вядзецца. Адказных за ільназагатоўкі няма. Нічога ня зроблена па арганізацыі пераапрацоўкі ільну сярод аднаасобнага сэктару.

Нічога ня зроблена ў гэтай галіне і райза. Такія-ж адносіны да пытань пэў уборкі і апрацоўкі ільну існуюць у сельсаветах. Старшыні—рэкамэндаваныя раённымі арганізацыямі, як лепшыя—**Сакалішчанскага** сельсавету **Вашкёў і Клясіцкага**—толькі перапісваюць прысланыя з раёну пляны.

Усе прыведзеныя факты паказваюць, што ільназавод і кантора загатільну не падрыхтаваліся да падыходзячай ільназагатоўчай кампаніі. Калі становішча ў бліжэйшыя дні ня зьменіцца, дык мы будзем сьведкамі паўтарэньня леташняй кулацкай практыкі, якая была ва многіх мясцох, калі дзяржаве здавалася ільнапрадукцыя ніякай якасьці.

М. Я.

РУПАР КУЛАЦКІХ СПРАЎ

(*„КАЛЕКТЫВІСТ РАСОНШЧЫНЫ", Расонскі раён*)

Расоншчына зьяўляецца адным з ільнаводчых раёнаў. Пасеўная плошча ільну складае 5.262 га, у тым ліку па калгасах 3.225 і па аднаасобным сэктары 2.036 га. Здавалася-б, што гэтай вядучай культуры раённая газэта «Калектывіст Расоншчыны» павінна была аддаць максымум увагі.

А што ёсьць на справе?

У раёне паасобныя калгасы (**«Чырвонае Сакалішча», «Беларускі батрак»** і інш.) пасьля церабленьня прыступілі да першапачатковай апрацоўкі ільну. Але як? Замест ачосу галовак, у гэтых калгасах пачалі абразаць іх касамі. Такім чынам, даўжыня сьцябла скарачаецца на 10-15 сантымэтраў. Рэзка зьніжаецца яго якасьць і значная частка трасты выходзіць непрыгоднай для заводжай апрацоўкі.

Ясна бяз слоў, **што** гэта такое. Кулацкая правакацыя, шкодніцтва, арганізаванае клясава-варожымі элементамі, якія маюць на мэце папсаваць лён, зьніжаць ураджайнасьць, сарваць здачу дзяржаве высокаякаснай ільнапрадукцыі.

Як газэта выкрывае новыя мэтады, новую тактыку кулака ў яго шкодніцтве? Як яна змагаецца супроць гэтай кулацкай правакацыі? **«КАЛЕКТЫВІСТ РАСОНШЧЫНЫ» НАСТОЛЬКІ СТРАЦІЎ СВАЮ КЛЯСАВУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ, ШТО САМ СТАЎ РУПАРАМ КУЛАЦКІХ НАСТРОЯЎ.**

У нумары ад 2 жніўня зьмешчана заметка **«Псавяць лён нельга і шкодна»**, дзе газэта піша:

«Каб выканаць дырэктывы партыі і ўраду па павышэньні ўраджайнасьці, мы павінны пасеяны лён... уважліва і якасна абразаць...».

І далей:

«Калгас «Расоны» вырваў 2 га ільну, які абрэзаў і памачыў».

Такім чынам, што павінны рабіць калгасы: абразаць галоўкі ці ачосваць — як бачым, для рэдактара «К. Р.» няма ніякай розьніцы. Ён за тое каб абразаць (псаваць) лён.

Газэта па гэтым не супакойваецца. У той-жа заметцы газэта піша:

«Пры церабленьні лён не сартаваўся, а таму атрымаўся куль ільну з кароткай і доўгай трастой. **ПРЫ АБРЭЗЦЫ ГАЛОВАК, НАВАТ КАЛІ-Б І НЕ ЖАДАЎ ПСАВАЦЬ ДАЎЖЭЙША ГА ВАЛАКНА, ТО ПРЫХОДЗІЦЦА, ІНАКШ БОЛЬШ ПАЛОВЫ ЗАСТАЕЦЦА Ў КУЛІ».**

(Падкрэсьлена намі — **Рэд.**).

Выходзіць, што выхаду няма, хочаш ня хочаш, а галоўкі трэба абразаць. Пасьля гэтага ня дзіва, што ў раёне каса набыла масавае прыстасаваньне. Такім чынам, фактычна газэта стала кулацкім рупарам, які агітуе за шкодніцкія мэтады першапачатковай апрацоўкі ільну. Мы скажам словамі «К. Р.», што ня толькі «псаваць лён нельга і шкодна», але яшчэ больш шкодна і яшчэ больш злачынна агітаваць за абрэзку.

Агітацыя газэты за абрэзку галовак невыпадковая. Лінія газэты ў гэтым пытаньні ёсьць рэзультат шырока распаўсюджаных у раёне антымэханізатарскіх тэндэнцый, супроць якіх газэта не вядзе ніякай барацьбы. У раёне амаль усе 41 церабілка «Камсамолка» і 19 машын Гільштэйна для ачосу галовак стаяць у калгасах і не скарыстоўваюцца. А газэта маўчыць. Як палітычны сьлепец, газэта не заўважыла работы клясавага ворага ў тым, што пробныя выезды церабілак на ільняныя палі ў радзе калгасаў адзначыліся масавай паломкай машын. Для газэты застаўся незаўважаным нават і такі факт, што ў раёне 1 жніўня пачалася масавая ўборка ільну. Таму яна ня стала масавым арганізатарам бальшавіцкай уборкі і пераапрацоўкі тэхкультур.

Апартуністычная практыка рэдактараў «К. Р.» служыць лепшым прыкладам, як прыступленьне клясавай пільнасьці разьвязвае рукі клясаваму ворагу. Абрэзка галовак павінна быць неадкладна спынена, як кулацкая, шкодніцкая практыка. А не абароцы, як патхніцелі, павінны панесьці самую суровую адказнасьць.

Сыгнал з Расон — суровае папярэджаньне ўсім ільнаводчым раёнам і іх газэтам.

Максымальна скарыстаць пскоўскі палепшаны спосаб апрацоўкі

Тав. Хацько, член партыі, былы чырвонаармеец, прыняў калгас «Чырвоная зорка» перад пачаткам пасеўнай. Засьмечанасьць клясава-чужымі элементамі і бесгаспадарчасьць—вось спадчына ранейшага кіраўніцтва калгасу, пераданага Хацько. У пачатку сваёй работы тав. Хацько ўзяўся за ачыстку ад кулацка-шкодніцкіх элементаў і за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасу. У рэзультаце плян пасеўнай выканан на 101 проц. Замест 344 га пасеяна 356 га. **А вядучай культуры—ільну пасеяна замест 110—112 га.**

Упартая работа і выразная клясавая лінія, рашучая барацьба з абязьлічкай і ўраўнімаўкай вывелі калгас у перадавыя. Ход уборачнай — лепшы таму доказ. Тэмпы ўборкі і якасьць уборачных работ у калгасе заўсёды на першым пляне. Так, жніво 190 га жыта праведзена за 7 дзён. На жніве працавалі 4 жнівяркі з зерняўлоўнікамі і 67 жанчын з 91. Уся рабочая сіла разьбіта на 4 паляводчыя брыгады, у якіх арганізаваны звяньні. Паміж брыгадамі і звяньнямі арганізавана сацыялістычнае спаборніцтва.

Вялікую работу праводзіць і камсамольская ячэйка. Усе камсамольцы знаходзяцца непасрэдна на вытворчасьці і расстаўлены па брыгадах. Яны праводзяць шырокую палітмасавую работу ў полі і бібліятэцы калгасу. У кожнай брыгадзе з ліку камсамольцаў ёсьць брыгадны агітатар.

Для ўліку работы і кантролю за якасьцю ў калгасе выбрана камісія на чале з сакратаром камсамольскай ячэйкі **Ісэрманам.** Пасьля выкананьня работы камісія прымае яе ад брыгадзіра.

Узорна ў калгасе пастаўлена барацьба са стратамі і ахова ўраджаю. Пасьля ўборкі збожжавых праводзілася пад грабаньне каласоў. Усе зжатыя снапы строга ўлічваюцца брыгадзірамі і перадаюцца вартаўнікам для аховы. У калгасе ёсьць пастаянныя вартаўнікі. Апрача таго, яшчэ вылучаюцца кантрольныя вартаўнікі на чарзе са складу калгаснікаў. У абавязкі кантрольных вартаўнікоў уваходзіць ахова калгаснага ўраджаю і праверка адносін да сваіх абавязкаў пастаянных вартаўнікоў.

Правядзеньне раду арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў спрыяла павышэньню прадукцыйнасьці працы і павышэньню працоўнай дысцыпліны ў калгасе. Выхад на работу—пагалоўны. Кожны брыгадзір і калгасьнік не дае свае абавязкі пляны і заданьні.

У калгасе створаны дзіцячыя яслі на 30 чалавек і на 40 чалавек дзіцячая пляцоўка. У рэзультаце ўсе праца здольныя жанчыны выходзяць на работу і ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Так, у часе жніва некаторыя калгасьніцы другой брыгады, перавыконвалі нормы выпрацоўкі на 100 проц.

Калгас у сувязі з добра праведзенай пасеўнай кампаніяй, чакае добрага ўраджаю. Калгасьнікі навочна ўбачылі рост калгасу. Таму і змагаюцца за працадзень. Ураджайнасьць збожжавых узрасла да 8 цэнт., замест 6 цэнт. у мінулым годзе. Калі ў мінулым годзе на працадзень прыпадала 936 грам жыта, дык сёлета наводле папярэдніх даных пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай і стварэньня ўсіх фондаў, на адзін працадзень мяркуецца выдаць 1 кгр. 330 гр. Ёсьць лепшыя калгасьнікі, якія атрымаюць за ўвесь год толькі аднаго жыта 1300 кгр. Да такіх адносяцца: **Прагоў Мацьвей, Макрыцкі Юльяк, Плакса Нікіфар, Сьвятліцкі Алесь і інш.** За ўвесь год на сярэдняга калгасьніка прыпадае 930 кгр. жыта ((**Шнасны Ягор, Антанёнка Мардзін, Сьвятліцкі Герасім** і г. д.). Іншых збожжавых культур летась прыпадала на працадзень 72 грамы, а сё

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

СССР і Уругвай

Народным Камісарыятам па замежных справах атрымана 12 жніўня г. г. тэлеграма ад міністра замежных спраў Уругваю пана Альбэрто Манэ.

З Монтэвідэо 11 жніўня 1933 г.

Яго высокаправаехадзіцельству Народнаму Камісару па замежных справах.

Масква.

Я рад паведаміць вам, што з прычыны ўсё больш павялічанага аб'ёму гандлёвых адносін паміж Уругваем і СССР мой урад парашыў устанавіць з СССР пастаяннае дыпляматычнае представіцтва на аснове тэлеграм ад 21 і 22 жніўня 1926 г. У той-жа час мой урад прапануе СССР заключэнне гандлёвага дагавору паміж абедзьюма краінамі, што, як ён спадзяецца, сустрэне спрыяючыя адносіны з боку вашага ўраду.

АЛЬБЭРТО МАНЭ. МІНІСТАР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ УРУГВАЮ.

13 жніўня г. г. ч. в. а. народнага камісара па замежных справах тав. Н. Н. Крэсьцінскі паслаў міністру Замежных спраў Уругваю пану Альбэрто Манэ ў адказ наступную тэлеграму:

Масква, 13 жніўня 1933 году.

п. Альбэрто Манэ, міністру замежных спраў Уругваю.

Монтэвідэо.

У адказ на вашу тэлеграму ад 11 жніўня г. г. рад паведаміць вам, што ўрад СССР прыняў да ведама рашэньне уругвайскага ўраду устанавіць пастаянае дыпляматычнае представіцтва ў СССР, і, у сваю чаргу, назначыць свайго дыпляматычнага представіча ў Монтэвідэо. Разам з тым, даводжу да вашага ведама, што савецкі ўрад прымае прапанову ўраду Уругваю аб уступленьні ў перагаворы з мэтай заключэньня гандлёвага дагавору паміж СССР і Уругваем.

Ч. в. а. народнага камісара па замежных справах Н. Н. КРЭСЬЦІНСКІ.

Морскія ўзбраеньні Польшчы

ВАРШАВА, 14. (Уласн. інф. «Зьвязды»). «Газэта польска» зьмяшчае даныя аб польскім морскім і рэчным ваенным флёце.

Газэта піша: «Ваенны морскі флёт Польшчы мае **5 сучасных адзінак**: два контр-тарпэдаўцы — «Віхар» і «Бужа», **тры падводных лодкі**—«Вільк», «Рысь» і «Жбік». Усе гэтыя судны пабудаваны на францускіх верфях і маюць францускае ўзбраеньне. Судны абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі і прыстасаваны да плаваньня па Бальтыцкім моры.

Кожны контр-тарпэдавец, узброены **чатырма 130-міліметровымі гарматамі, 6 тарпэда-метацелямі** і абсталяваньнем для пуску мін з палубы. Падводныя лодкі маюць **па 6 тарпэда-метацеляў**, па адной 75 м. м. гармаце, а таксама запас мін, якія ўстанаўляюцца пад вадой. Апроч гэтага ваенны флёт мае **5 тарпэдаўцаў**: «Мазур», «Шлёнск», «Краковяк», «Падгалянін» і «Куявяк». Гэтыя тарпэдаўцы пабудаваны ў Германіі і перароблены паводле апошніх дасягненьняў тэхнікі ў польскіх партовых майстэрнях ваеннага флёту.

Транспартнае ваеннае судно «Вілія» служыць для транспартаваньня ваенных матар'ялаў для арміі і морскага флёту.

Дапаможныя судны: матка для падводных лодак «Людамір Чэрніцкі», дзьве вучэбныя канонеркі — «Камендант Пільсудскі» і «Генэрал Галер» і парусное вучэбнае судно «Іскра»; судна-казармы «Балтык», «Смок», некалькі буксіраў і суднаў для перавозкі нафты і міны.

Зараз будуюцца ў краёвых верфях **4 траўлышчыкі**, якія павінны замяніць устарэлыя і дзеля гэтага вынятыя з ужытку траўлышчыкі. У хуткім часе распачнецца пабудова на францускай верфі мінаносца, які адначасова будзе зьлучацца вучэбным судном. Апрача морскага флёту, Польшча мае рэчную ваенную флётылію на Прыпяці і Ніе, задачай якой — абарона Польшчы на Усходзе.

Ваенны морскі порт знаходзіцца ў **Гдыні**, а порт рэчнай ваеннай флётыліі ў **Пінску**».

АБВАСТРЭНЬНЕ АУСТРА-ГЕРМАНСКАГА КАНФЛІКТУ

Антыаўстрэйская прапаганда германскіх радыёстанцый ня спыняецца

БЭРЛІН, 14. (Белта). Учора, згодна паведамленьня агэнцтва Конці, Мюнхенскай радыёстанцыяй перадавалася прамова (прозьвішча прамоўцы не паведамляецца) «аб становішчы ў Аўстрыі». Прамоўца сьцьвярджаў, што ў Аўстрыі прабуюць прыпчаніць насельніцтву старой германскай правінцыі Остмарк — («Остмарк», — усходняя правінцыя — так называлася ўласна Аўстрыя ў пэрыяд да Габсбургскай імпэрыі, калі яна была яшчэ часткаю Германіі) — панящці «аўстрыйскай культуры», «аўстрыйскага чалавека» і г. д.

«Заграніцаю — гаварыў далей прамоўца — прабуюць устанавіць сяброўскія сувязі паміж аўстрыйцамі, французамі і чэхамі». Прамоўца ў процівагу гэтаму, сьцьвярджаў, што Остмарк была і застанецца блізкім сябрам Германіі і што з 1918 году па Сэн-жэрманскаму дагавору Аўстрыя «была асуджана на бяздзеяньне самастойнасьць».

«Нямецкія аўстрыйцы, — заявіў прамоўца, — адкідаюць тое, чаго жадае Францыя. Яны ня будуць у будучым змагацца за чужыя ідэі. Трагічная гісторыя Остмарк закончыцца тады, калі Аўстрыя зноў стане ўсходняй правінцыяй («Остмарк») Германіі».

***

ВЕНА, 15 (Белта). Учора па радыё зноў была перадана прамова былога кіраўніка нацыянал-сацыялісцкай арганізацыі Штырыі-Кнаўса—на гэты раз ня з Мюнхэна, а з БРЭСЛАЎЛЯ.

У БРАУНАУ (Верхняя Аўстрыя) на кватэры нацыянал-сацыяліста ВАЙЕРА арыштавана група аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў, якая падрыхтоўвала нелегальную пераправу ў Германію, каб уступіць там у «аўстрыйскі легіён» у ЛЕХФЭЛЬДЗЕ. Байер пераправіў ужо ў Германію 3.000 аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў. Паводле яго споў, 15 тысяч аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў прайшлі ваенную падрыхтоўку ў Германіі. Кіраўнікі пераправы запэўнівалі адпраўляемых нацыянал-сацыялістаў, што самае позьняе праз два месяцы «Аўстрыйскі легіён» у Лехфэльдзе будзе накіраван супроць Аўстрыі.

Афіцыёз «РЭЙХСПОСТ» апублікаваў у экстранным выданьні ліст віднага работніка зьнешня-палітычнага аддзелу германскай нацыянал-сацыялісцкай партыі ШНЭЙДЭРА, у якім асабліва падкрэсьліваецца важная роля, што выпадае на долю створанага пад кіраўніцтвам нацыянал-сацыяліста Рэшні аўстрыйскага легіёна ў Лехфэльдзе. «У справе заваёвы Аўстрыі» апошнім сродкам,—піша Шнэйдар,—зьяўляецца Рэшні. Выдатныя хлопцы прыходзяць у легіён натоўпамі. Яны прыходзяць з Альпійскіх правінцый у бездакорнай форме аўстрыйскіх нацыянал сацыялістаў, бо ўдзел у легіёне не аўстрыйцаў мог-бы выклікаць зьнешнепалітычныя затрудненьні». «РЭЙХСПОРТ» публікуе рад дакумантаў, з якіх відаць, што венская нацыянал-сацыялісцкая арганізацыя атрымоўвала з Берліну 10 тысяч марак штомесячна. У памянутым лісьце Шнэйдар паведамляе аб перагаворах зьнешня-палітычнага аддзелу германскай нацыянал-сацыялісцкай партыі ў Берліне з югаславскім паслом, відавочна, аб адносінах Югаславіі да нацыянал-сацыялісцкага перавароту ў Аўстрыі. Шнэйдар піша: «Германію ў зьнешня-палітычных адносінах чакае поўны правал, калі ёй не ўдасца вырашыць аўстрыйскае пытаньне». Апублікаваныя ў «Рэйхспост» дакуманты—у цэнтры ўвагі ўсяго аўстрыйскага друку.

Дэманстрацыі германскіх фашыстаў на граніцы Чэхаславакіі і Швэйцарыі

БЭРЛІН, 14. (Белта). Учора ў **Герліцы** не далёка ад германа-чэхаславацкай граніцы быў арганізован «пагранічны дзень авіяцыі». Былі паладжаны палёты эскадрыльляў. Германскімі лётчыкамі дэманстраваўся вышэйшы пілётаж. Учора-ж у **Канстанцы**, каля швэйцарска-германскай граніцы, быў арганізован пагранічны зьлёт нацыянал-сацыялістаў з **Бадэну, Вюртэмбэргу і Баварыі.**

На зьлёце прысутнічалі: баварскі намесьнік **фон-Эпп**, премьер **Зібэрт і** міністар унутраных спраў Баварыі **Пфлюмер.** Аб мэтах зьлёту нічога не паведамляецца.

Становішча буйнай сельскай гаспадаркі ў капіталістычных краінах

Становішча сельскай гаспадаркі ў капіталістычных краінах настолькі пагоршылася, што самі буржуазныя эканамісты ня могуць прамаўчаць гэтага факту. У апошнія часы часта праскальзываюць кароткія весткі аб цяжкім становішчы сельскай гаспадаркі. Руйнуюцца ня толькі дробныя сялянскія гаспадаркі, але і буйныя абшэрніцкія маёткі.

Міжнародны інстытут сельскай гаспадаркі ў Рыме апублікаваў справаздачу аб становішчы сельскай гаспадаркі ў краінах цэнтральнай і ўсходняй Эўропы.

«Становішча краін цэнтральнай і ўсходняй Эўропы, піша справаздача, — вельмі цяжкае. Найбольш адулі сучасны крызіс сельска-гаспадарчыя краіны. Зьніжэньне цэн на сельгаспрадукты прывяло да дэфіцытнасьці сельскай гаспадаркі.

Напрыклад, у **Польшчы** чысты прыбытак з гэктара зьменшыўся з 103,7 злот. у 1929-30 годзе да 26,96 злот. у 1930-31 годзе і зусім яго ня было ў 1932-33 годзе. У Румыніі чысты прыбытак з гэктара зьменшыўся з 2 тысяч 739,3 лей у 1929-30 годзе да 830,45 лей у 1930-31 годзе.

Скарачэньне замежнага гандлю гэтых краін, большую частку экспарту якіх складаюць сельгаспрадукты, і скарачэньне пакупной здольнасьці ўнутранага рынку прыяяло да таго, што на складах награмадзіліся вялікія запасы тавараў, якія ня маюць ніякага віду на збыт.

Гэтакае становішча парушыла раўнавагу паміж прыбыткамі і выдаткамі і прывяло да значнай запазычанасьці сельскай гаспадаркі. Даўгі так моцна абцяжараюць бюджэты сельскіх гаспадарак, што амаль ня прыходзіцца спадзявацца на выплату іх. У асабліва цяжкім становішчы знаходзяцца сяляне, якія ўзялі пазыкі у прыватных асоб (чытай — кулакоў!—Н.) на высокі спэкуляцыйны працэнт».

Прыведзеная намі цытата справаздачы апісвае толькі становішча буйных зямляўласьнікаў. Яона, што становішча працоўнага сялянства яшчэ горшае. Там панае галеча і голад.

Н.

Гітлераўская чатырохгодка ў... 300 год

Германскі міністар гаспадаркі аб ажыцьцяўленьні нац-сацыялістычнай праграмы

БЭРЛІН, 14. (Белта). Міністар гаспадаркі ШМІДТ выступіў у Кедьне перад прадстаўнікамі прамысловасьці, гандлю і выпэйшымі дзяржаўнымі чыноўнікамі з прамоваю, у якой перасьцярагаў ад памылковага ўяўленьня, быццам у галіне гаспадаркі мы будзем ісьці «ад перамогі да перамогі», альбо «што шляхам гвалтоўнага ўмяшаньня і пры дапамозе пераможных паведамленьняў аб ліквідацыі беспрацоўя ў мясцовым маштабе можна вырашыць праблему беспрацоўя. «Нявольна раскрываючы ўсю няхітрую мэханіку нацыянал-сацыялісцкай праграмы» выпукланьне работ і «ліквідацыю беспрацоўя», Шмідт указаў, што ўсе гэтыя **«штучныя меры ўраду ня здольны стварыць сапраўднае гаспадарчае ажыўленьне».**

Асаблівае ўвагі заслугоўвае заява Шмідта, што так званае выпукланьне работ і хвалёная «ліквідацыя беспрацоўя» часта зводзяцца да таго, што «беспрацоўныя адной акругі выцясняюцца ў другую».

У заключэньне, упамянуўшы, што германская гаспадарка «цяжка хворая», Шмідт указаў на неабходнасьць стварэньня такіх умоў, у якіх прадпрыемца «мог-бы вольна абараняць сваю думку», а прадпрыемствам кіравалі-б «кампэтэнтныя асобы».

У тым-жа духу сказаў прамову на партыйнай канфэрэнцыі нацыянал-сацыялістаў Турынгіі намесьнік Заўкель. Паводле слоў Заўкеля, **«ажыцьцяўленьне нацыянал-сацыялісцкай праграмы — гэта справа нават не аднаго стагодзьдзя; для гэтага, бадай, патрабуецца 200-300 год».**

Бурныя хваляваньні на Кубе

ВАШЫНГТОН, 14. (Белта). Як паведамляюць з ГАВАНЫ, дэлегацыя бастуючых наведала новага прэзыдэнта Кубы **СЭСПЭДЭСА** і патрабала неадкладна вызваліць палітзьняволеных, легалізаваць аб'яднаньне прафсаюзаў і задаволіць эканамічныя патрабаваньні рабочых. **СЭСПЭДЭС** цьмяна абяцаў задаволіць патрабаваньні пасьля адкаўленьня парадку. Сканцэнтраваньне войск у ГАВАНЕ працягваецца. Войскам загадана адкрываць агонь па «на рушальніках парадку». Ня гледзячы на забарону, у Сант-Яго адбылася дэманстрацыя з чырвонымі сьцягамі і камуністычнымі песьнямі. Як паведамляе «ЮНАЙТЭД ПРЭС», урад ПАЗШ баіцца, што новы ўрад Кубы знаходзіцца пад пагрозай. **РУЗВЭЛЬТ** распарадзіўся адпраўіць з ваенных судны на Кубу. Два амэрыканскіх контр-мінаносца ўжо прыбылі ў Гавану, трэці—ў дарозе. Адданы загад аб адпраўцы крэйсэра.

У заяве Рузвэльта прадстаўнікам друку гаворыцца, што «апошнія паведамленьні ўказваюць на хваляваньні ў некаторых частках Кубы і на акты гвалту з боку вядомых элемэнтаў насельніцтва».

У заяве ўказваецца далей, што адпраўка ваенных суднаў на Кубу становіць сабе мэтаю «абарону жыцьця амэрыканскіх грамадзян».

Аб перавозцы збожжа па чыгунках

Тэлеграма ўсім начальнікам дарог і раённым кіраўніцтвам па перавозках

МАСКВА, 14 (Белта). Транспарт уступіў у пэрыяд узмоцненых перавозак збожжа, і з першых-жа дзён выявілася непадрыхтаванасьць раду дарог да выкананьня гэтай адказнай задачы. Асабліва дрэнна забясьпечваецца пагрузка на Паўночна-Каўкаскай, Рязана-Уральскай, Самара-Златаўстоўскай і Пермскай дарогах. Вагоны падаюцца не ў адпаведнасьці з заўленымі адпраўшчыкамі плянамі. Не падаюцца вагоны ў першую чаргу ў тых мясцох, дзе захаваласьці збожжа пагражае небясьпека. Вагоны ў мясцох пагрузкі падаюцца з наспраўнымі кузавамі, начышчаныя. Ня выконваюцца графікі пагрузкі маршрутаў. За кошт па грузкі збожжа дапускаецца пагрузка іншых, другараднага значэньня, грузаў.

Такое становішча ў самым пачатку збожжавых перавозак выклікала перапаўненьне некаторых складаў, неабходнасьць складваць збожжа ў сьцірты, пагрозу затрымкі па прыёму збожжа ад збожжаздатчыкаў і псаваньне яго на станцыях.

ЗАГАДВАЮ:

Пад вашу асабістую адказнасьць узяць непасрэднае кіраўніцтва перавозкай збожжа, лічачы процантнае выкананьне плану першачарговым баявым заданьнем. Пагрузку збожжа забясьпечыць пераважаю перад усімі грузамі, у першую чаргу тых станцый, дзе скапленьне збожжа пагражае яго псаваньнем і затрымкай збожжапаставак. Асабліваю ўвагу павінна быць аддана на тольки поўнаму забесьпячэньню пагрузкі збожжа зусім спраўнымі вагонамі і шчытамі, а таксама правільнаму рэгуляваньню гэтай пагрузкі па асноўных напрамках у адпаведнасьці з прапускной здольнасьцю, падрыхтоўкай станцый на савага прыбыцьця збожжа і прыёму яго, хуткаму вызваленьню вагонаў, дабіваючыся гэтага праз кравыя і абласныя арганізацыі. Асабліваю ўвагу зьвярніце на арганізацыю рамонтных брыгад, забясьпечаных матар'ялямі для рамонту ў пунктах масавай пагрузкі збожжа.

На ўсіх дарогах масавай пагрузкі збожжа дарожныя збожжавыя тройкі, пад старшынствам начальнікаў дарог, павінны працаваць рэгулярна. Праводзьце рашучую барацьбу з усякімі правамі разгільдзяйства, вычэрпальна асьвятляйце ў дзённых справаздачах выкананьне пляну, указваючы канкрэтных вінаватых у зрыве іх, падрыхтоўку пагрузкі на наступную дэкаду, намечаныя мерапрыемствы па забесьпячэньні перавозкі.

Папярэджваю ўсіх начальнікаў дарог, што ацэнка работы дарог будзе рабіцца ў першую чаргу па тым, як яны здолелі спраўіцца з выкананьнем збожжавых перавозак.

Наркамшляхоў АНДРЭЕЎ.

Новае папаўненьне палітаддзелу МТС

МАСКВА, 15. (ТАСС). 14 жніўня адбыўся сход, прысьвечаны провадам у палітаддзелы МТС новага папаўненьня — 720 чалавек для работы ў якасьці рэдактароў газэт і жанарганізатараў. Да канца году лік жанарганізатараў і рэдактароў у палітаддзелах будзе павялічан да 5.000. 8.400 адборных бальшавікоў-палітаддзельшчыкаў, лепшых сыноў партыі ўжо працуюць у МТС і калгасах. Да 1 кастрычніка лік іх будзе перавышаць 10.000. Сярод пасланых больш паловы рабочых, — 81 проц. маюць ня менш 13-гадовага партыйнага стажу, больш паловы — з вышэйшай партыйна-палітычнай асьветай. Сход ад крыў начальнік палітуправы МТС Наркамзему СССР, нам. загадчыка сельскагаспадарчага аддзелу ЦК тав. Крыніцкі. З прамовай выступіла загадчык агітмасавым аддзелам ЦК тав. Нікалаева і тав. Крыніцкі, які ўказаў, што палітаддзелы прарабілі вялікую работу і цяпер павінны рухацца яшчэ далей, забіраюцца ў самае сэрца калгаснай вытворчасьці — у брыгаду, участ'ёк узяцца за аўладаньне машыннай тэхнікай, зрабіць калгасныя парт'ячэйкі такімі-ж моцнымі, як на фабрыках і заводах.

Пад бурныя апладысмэнты сход прыняў прывітаньне тав. Сталіну, Кагановічу і ЦК УсеКП(б).

АБ СЬВЯТКАВАНЬНІ УСЕСАЮЗНАГА ДНЯ АВІЯЦЫІ— 18 ЖНІЎНЯ 1933 Г.

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ МЕНГАРСАВЕТУ ад 16 жніўня 1933 г.

У сувязі з правядзеньнем сьвяткаваньня ўсесаюзнага дня авіяцыі, прэзыдыум Менскага гарадзкога савету пастанаўляе:

1. 17 жніўня 1933 году а 18-й гадзіне правесьці ўрачысты пленум Менскага гарсавету сумесна з партыйнымі, камсамольскімі, грамадзкімі і прафэсыянальнымі арганізацыямі, прысьвечаны дню авіяцы.

2. Абавязаць кіраўнікоў усіх прадпрыемстваў, грамадзкіх, прафэсыянальных і каапэратыўных арганізацый да 18-й гадз. 17 жніўня г. г. упрыгожыць займаемыя імі памяшканьні домаўладаньні сьцягамі, плякатамі і лёзунгамі.

3. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскласьці на РС міліцыю.

Старшыня Менскага гарадзкога савету КАРАНЕЎСКІ.

Сакратар Менскага гарсавету КАПЯЛЕВІЧ.

ПЛЯН правядзеньня ўсесаюзнага дня-авіяцыі ў г. Менску 18-VIII-33 г.

1. Палітмасоўка на Усебеларускім стадыёне.

Збор рабочых прадпрыемстваў арганізаваны, калёнамі, з лёзунгамі, аркестрамі і іншым мастацкім афармленьнем.

Збор рабочых на стадыён—да 11 гадз. 30 мін. Адказны тав. БАЙКАЧОЎ.

Мітынг ад 11 гадз. 30 мін. да 13 гадз. 30 мін.

2. Паветраны парад — ад 13 гадз. 30 мін. да 14 гадз.—Адказны тав. ЮНГ.

3. Спартыўныя выступленьні—ад 14 да 15 гадз. 30 мін. Адказны тав. ЦІМОХІН.

4. Футбольны матч Масква—Менск. Адказны тав. ЯКУБОЎСКІ.

5. Мастацкія выступленьні на адчыненых эстрадах—арганізоўвае тав. БАЙКАЧОЎ.

6. Масавыя гульні. Адказны тав. ФУРЭМС.

7. Упрыгожваньне стадыёну—арганізоўвае Савет фізкультуры.

8. Арганізацыю парадку на стадыёне (указаньне месц, маршрутаў і г. д.) даручыць тав. КРУЧКОВУ і заг. стадыёну.

10. Масавыя экскурсіі на аэрадром і пад'ём ударнікаў на самалётах. Адказныя —т. т. ДЫГУН і ГАЛКОЎСКІ.

Экскурсіі праводзяцца на аэрадрома з 11 раніцы да 3 гадзін дня ў арганізаваным парадку. Кіраўнікі па аэрадрому—ад авіячасьцей.

11. Карнавал цыркаў па гораду, прысьвечаны дню авіяцыі.

ГАРАДЗКАЯ КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ДНЯ АВІЯЦЫІ.

ЦСПСБ да дня авіяцыі

ЦСПСБ распрацаваў рад мерапрыемстваў па дзіравядзеньні дня авіяцыі. Гэты дзень павінен быць праведзен, як масавае сьвята працоўных пад знакам азнаямленьня шырокіх рабочых мас з вялізарнейшымі дасягненьнямі рабочае клясы і партыі ў справе стварэньня магутнай савецкай авіяцыі.

Мабілізуючы ўвагу працоўных на выкананьне задач другой пяцігодкі па авіябудаўніцтве і ўкараненьні авіяцыйнай культуры ў шырокія масы працоўных, ЦСПСБ абавязаў гарпрафсаветы і ФЗМК на ўсіх прадпрыемствах, установах, клюбах і чырвоных кутках правесьці даклады і лекцыі на тэму: «Міжнародное становішча і задачы ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны», а таксама значэньне і роля авіяцыі ў абароназдольнасьці краіны і народнай гаспадаркі.

Апрача таго прапанавана ЦК саюзаў, ГРПС і ФЗМК правесьці ўзаемную самаправерку заключаных сацдагавораў паміж прадпрыемствамі і авіячасьцямі, прычым ЦК саюзаў, якія шэфствуюць над авіячасьцямі, даручана арганізаваць пасылку рабочых дэлегацый і агітбрыгад у падшэфныя ім часьці. На мясцох арганізаваць масавыя сумесныя вечары, на якіх вызначаць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні шэфскай работы на РСЧА і авіячасьцямі.

Віцебскаму гарпрафсавету да дня авіяцыі даручана арганізаваць прыняцьцё пастаяннага шэфства над авіяшколай, адным з буйнейшых прадпрыемстваў, забясьпечыўшы яму штодзённую дапамогу ва ўсёй правядзімай рабоце.

Для правядзеньня масавай растлумачальнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў аб значэньні дня авіяцыі і аказаньня дапамогі ў арганізацыі ўсебеларускага чырвонага абозу на 18 жніўня на здачы збожжа дзяржаве, даручана шэфствуючым арганізацыям выехаць у падшэфныя сельсаветы.

На буйнейшых прадпрыемствах, якія маюць больш 1.000 рабочых, арганізаваць авіяцыйныя гурткі.

Менскаму, гомельскаму і віцебскаму гарпрафсаветам аказаць практычную дапамогу арганізацыям Асавіяхіму па адкрыцьці ўсебеларускага аэраклюбу ў Менску, аэраклюбаў у Віцебску і Гомелі і плянёрных станцый у Менску, Віцебску, Гомелі, Воршы, Бабруйску і Магілеве.

Для абсталяваньня прох плянёрных станцый у Менску, Гомелі і Віцебску, ЦСПСБ адпусьціў 5.000 руб., апрача таго 2.000 руб. адпушчана для праміраваньня лепшых лётнікаў ударнікаў гомельскіх авіячасьцей.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Сёньня, 16 жніўня, а 3-й гадзіне дня, у рэдакцыі газэты «ЗЬВЯЗДА» (Савецкая, 63, 3-ці паверх, пакой крамсэктару) АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА ШТАБУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎСЕСАЮЗНАГА СУПРОЦЬПАЖАРНАГА РЭЙДУ.

На пасяджэньне будуць разгледжаны пытаньні аб ходзе рэйду па СССР (дакл. НАРКАМУНГАС БССР) і даклады прадстаўнікоў НАРКАМЗЕМУ і УПАЎНАРКАМСАЎГАСАЎ аб рабоце па арганізацыі супрацьпажарнай аховы ў саўгасах, калгасах і МТС. Апрача таго, даклад аб ходзе супрацьпажарнага рэйду ПА МЕНСКІМ РАЁНЕ.

На пасяджэньне апрача членаў штабу запрашаюцца дырэктар Белкамунбанку—РАЗЭНГАЎЗ, начальнік пажарнай аховы Менскага раёну — КАЗАЧОНАК, адказныя прадстаўнікі ад ЦКК НК-РСІ, УПАЎНАРКАМСАЎГАСАЎ, НАРКАМЗЕМУ, ТРАКТАРАЦЭНТРАЎ, НАРКАМФІНУ і ЦП САЮЗУ КАМУНАЛЬНІКАЎ.

Просьба да ўсіх таварышоў, якія выклікаюцца на пасяджэньне прыбыць з адпаведнымі матар'ялямі.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ СУПРОЦЬПАЖАРНАГА РЭЙДУ ПРЫ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА».

Загад № 494

па Народнаму Камісарыяту Асьветы БССР

10 жніўня 1933 г. *г. Менск*

У МЭТАХ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ СВАЯЧАСОВАГА І АРГАНІЗАВАНАГА ПАЧАТКУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

З А Г А Д В А Ю:

1. Загадчыкам АНА і сэктару кадраў НКА з 15 жніўня спыніць прыём заяў ад настаўнікаў аб пераводах, даўшы да гэтага-ж тэрміну адказ усім настаўнікам аб вынніках разгляду пададзеных імі заяў аб пераводах.

2. Заг. АНА праверыць персанальна зварот па працу ўсіх настаўнікаў з адпачынку, пры чым з асоб, якія зьяўляцца са спазьненьнем бяз уважальных прычын, утрымліваць заработак за кожны дзень прагулу, а да злосных прагульшчыкаў прымаць рашучыя меры, аж да звальненьня іх з працы.

3. Пад персанальную адказнасьць т. Бляхер у 48 гадзін давесьці да раёну прозьвішчы асоб, скончыўшых ВНУ, тэхнікумы і курсы, якія накіраваны на працу. Заг. АНА не пазьней 18 жніўня праверыць яўку ў раён усіх прызначаных НКА і аб асобах, якія не зьявіліся паведамляць НКА да 20 жніўня.

4. Катэгарычна папярэджваю ўсіх настаўнікаў і студэнтаў-выпускнікоў, што ніякія прычыны несвачасовай яўкі на працу прымацца пад увагу ня будуць і вінаватыя будуць прыцягвацца да адказнасьці.

Народны Камісар Асьветы ЧАРНУШЭВІЧ.

Кіраўнік справамі НКА ПАЛЯЎЦОЎ.

Гарадзкі сад

ДЭЯРЖЦЫРК —ШАПІТО.

ЧЭНЬНЯ І ШТОДЗЕННА ГБНОЎЛЕНАЯ ПРАГРАМА

НОВАЕ ВІДОВІШЧА СЬВЕТ ЖЫВЁЛЫ— экзатычнае ТАБЛО, зебры, ламы, цэбы, дзікі, драмадэры.

Германская дрэсіроўшчыца МАРГАРЫТА БАРУМ

Першае выступленьне ЛЕОРУКАНСКАГА— комік-эксцэнтрык.

Прымаюць удзел лепшыя сілы савецкіх і замежных цыркаў.

ВІСЁЛЫЯ КАЧАГАРЫ—тры маркі танцоры.

Папулярны артыст Саюзу ССР ЛЕАНІД ІЗЯКОЎ з яго новай групай дрэсіраваных розных парод жывёл і птушак.

4—ДЖЫОВАНІ — пеліёт у паветры.

ДАМІРАЎ і ГУРСІН—надзенная паліт-сатыра.

У праграме нумары розгнага жанру. Вялікая група дрэсіраваных коняй нямецкага цыркі.

ПАЧАТАК у 9 гадзін вечара.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр

Ад 16-га жніўня

новы экзэмпляр

„ХАЦІНА ДЗЯДЗЬКІ ТОМА"

у 6 частках.

—) ЗВЫШ ПРАГРАМЫ (—

гукавая хроніка Саюзкіно.

Пачатак у 2 гадзіны.

ЧЫГУНОЧНАЯ ЗОРКА Касе—ад 1 г. дня.

ДЗЯЎЧЫНА Ў ДЖУНГЛЯХ

„ПРАЛЕТАРЫ" Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. веч.

Мазмухін і Лісіна ў фільме „АЙЦЕЦ СЕРГІ"

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ

Мастацкі фільм ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ (зусім новы экзэмпляр)

„СПАРТАК" Касе—з 3 г. 30 м.

Ігор Ільінскі ў фільме Сьвята сьв. Іоргена

Весёлая камэдыя ў 7 част.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балету (будынак БДТ-1)

17-га жніўня

„Яўгені Анегін"

Лірычныя сцэны. Пастаноўка, рэж. Вольгі Барысевіч, муз. Чайкоўскага.

Пачатак у 9 гадз. вечара.

Білеты прадаюцца ў рабочай касе што дзенна ад 12 да 2-х і ад 4-х да 6 гадз. веч., а ў касе тэатру ад 12 да 2-х і ад 2-х да 5 гадз. веч.

НКПТ СССР „БУРВОДТРЭСТ"

Гомельская аддзяленьне па БССР і Заходняй вобласьці ўсесаюзнага дзяржаўнага буравога трэсту

ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ

на III—IV кварталы 1933 г. на БУРЭНЬНЕ АРТЭЗЬЯНСКІХ СТУДНЯЎ.

У заявах неабходна ўказваць наступнае:

1. Адрас работ (чыг. ст. і адлегласьць ад яе да месца работы).

2. Патрабуемая часовая працоўкай насьць артэзьвідравіны.

Пажадана адмеціць вышыні месца ад кладу сьвідравіны. Таксама пажадана прыкладаць да заяўкі заключэньні гідрагеолёгаў, калі такія ёсьць.

Работы праводзяцца круглы год.

Заяўкі накіроўваць: г. Гомель, вул. Леніна, 18, гомельская кантора бурводтрэст.

ВІЦЕБСКІ МЭХАНІКА-ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ПАЛІТЭХНІКУМ

абвяшчае набор студэнтаў

без адрыву ад вытворчасьці на мэханічную і канструктарскую групы ў колькасьці 50 асоб і з адрывам ад вытворчасьці на групы: мэханікаў, электрыкаў і цэплатэхнікаў у колькасьці 100 асоб. Прымаюцца асобы з адукацыяй у абсяг сямігодкі. Іспыты будуць праводзіцца з 15 па 20 жніўня па грамадазнаўству, матэматыцы, фізыцы, хэміі, родной мове і прыродазнаўству. Да заявы неабходна прыкласьці наступныя дакументы: засьведчаную анкету, мэтрычную выпіс, аб адукацыі, аб сацыяльным паходжаньні, ад сялян—даведку аб суме падатку ў 1932 г., аб стане здароўя, дзьве фотакарткі, аб праве гола су і нарэшце на 43 кап. для адказу. Набор працягваецца да 15 жніўня 1933 г.

Залічэньне забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам, сталоўкай на агульных падставах.

Дырэкцыя.

МЯНЯЮ кватэру ў Віцебску

на кватэру, або вялікі пакой у Менску. Звяніць: тэл. 21-166 з 11 да 3-х гадзін дня, або ў Віцебску, тэл. 7-63.

Менгарвк КП(б)Б, Гарфінаддзел і Гарплян 17 жніўня

СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ

старшынь, эканамістаў, плянавікоў і галоўбухаў прамыслова-каапэрацыйных арцеляй г. Менску і раёнаў,

а таксама кіраўнікоў і плянавікоў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці і прадстаўнікоў аб'яднаньняў сыстэмы прамкаапэрацыі

па пытаньні выкананьня прамфінпляну і пляну плацежоў у бюджэт.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні гарКК КП(б)Б, (вул. К. Маркса, 14, 2-гі паверх, пакой № 32).

Пачатак у 6 з пал. гадз. вечара.

ПУЦЁЎКІ ў санаторыі на паўднёвыя курорты па пашканых цэнах

ад 40 да 75 руб. золатам за месяц,

за жыльлё, стол і поўнае лячэньне апрача праезду можна АТРЫМАЦЬ на ўсіх

УНІВЭРМАГАХ ТАРГСІНУ БССР.

Па Менску ўнівэрмаг № 1—рог Савецкай і Ленінскай.

Пры жаданьні хворых, „Таргсін" прадстаўляе кансультацыю дактароў на прадмет вызначэньня курорта.

Белкантора „ТАРГСІН".

БЕЛГАНДАЛЬ праводзіць НАБОР

у школу гандлёва-таваразнаўчага вучнёўства па падрыхтоўцы кваліфікаваных працаўніковаў магазынаў і складаў.

Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодкі ва ўзросьце ад 17 год. Да заяў неабходна прыкласьці засьведчаную анкету, даведкі і аб сацыяльным стане вішчы, аб узросьце, аб здароўі і марак на 40 кап. для адказу. Прыём заяў да 1 верасьня. Школа забясьпечвае інтэрнатам стыпэндыяй і сталоўкай.

Адрас: Менск Савецкая, 47, Белгандаль, група кадраў.

Саюзны тэхнікум прамысловага хлебапячэньня

ў гор. Менску

АБВЯШЧАЕ дадатковы набор

студэнтаў на вінакурнае аддзяленьне (тэхніка-тэхналёга).

Адначасова працягваецца набор на аддзяленьне хлебапякарнай прамысловасьці саюзнага значэньня (тэхніка-тэхналёга і тэхніка-эканаміста)

Правілы прыёму аднолькавыя, што ў іншых тэхнікумы.

Прыём заяў—да 25 жніўня.

Адрас: Менск, Падгорны зав. 7.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЭРСЫТЭТ

паведамляе, што ўсе асобы, якія падалі ЗАЯВЫ аб паступленьні ў БДУ павінны зьявіцца для іспытаў 22-га жніўня, у 9 гадз. раніцы.

АРШАНСКІ ВУЧ